ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЕЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

Кошт номеру ў горадзе і раёнах 5 кап.

РЭДАКЦЫЯ: Палац працы, 3-ці паверх, пак. 39, 40, 41, 43. Тэлеф. агульны . 2-85, » рэдактара 1-73, » сэкрат. і к-ры . . 72

Падпісная цана ў месяц: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў — р. 80 к. Для ўстаноў . . . 1 » — » З дадаткам «Чырвоная Беларусь»: Для рабочых, служачых і калгасьнікаў 1 » — » Для ўстаноў . . . 1 » 20 »

Плата за абвесткі: За радок пэтыту . . . . . 30 кап. Для іншагародніх . . . . . 40 » Пры шматразовым друкаваньні скідка ад 30 да 50 проц.

ГОД ВЫДАНЬНЯ 14-ты.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФСАВЕТУ. № 73 || Чацьвер, 2-га красавіка 1931 г. || № 73

КАЛГАСЬНІКІ КАЛГАСУ „КОЛАС“ ДАЮЦЬ УЗОРЫ ЎДАРНАЙ ПРАЦЫ

АРГАНІЗАВАНА БРЫГАДА ІМЯ ГАЗЭТЫ „ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ“

У калгасе «Колас» падрыхтоўка да бальшавіцкага севу ў поўным разгары. Ачыстка насеньня ўжо скончана, рамантуецца інвэнтар. Цягавай сілай калгас забясьпечан добра, маецца наяўнасьць кармоў да канца пасеўкампаніі.

Калгасьнікі ў адказ на кулацкую вылазку высунулі свой сустрэчны плян, павялічыўшы плошчу па ўсіх культурах на 25 проц. Для пасьпяховай барацьбы за выкананьне пасеўнага пляну арганізавана ўдарная брыгада імя газэты «Віцебскі Пралетары». Калгасьнікі дзякуюць газэту, якая ўскрыла кулацкія махінацыі, вызваліла няправільна асуджанага т. Сьвятчанка. Калгасьнікі абавязваюцца праз газэту вырываць усе свае недахопы і сыстэматычна асьвятляць ход падрыхтоўкі да севу.

Сурганаў.

СПРАВА СЬВЯТЧАНКА — СПРАВА РУК АЗЬВЯРЭЛАГА КУЛАЧЧА

У АДКАЗ НА ВЫЛАЗКІ КЛЯСАВАГА ВОРАГА ПА БАЛЬШАВІЦКУ ПРАВЯДЗЕМ ГЕНЭРАЛЬНУЮ ПРАВЕРКУ ПАДРЫХТОЎКІ ДА СЯЎБЫ

Згуртуем бядняцка-серадняцкія масы на 100 проц. выкананьне пастановы Гаркому партыі аб уцягненьні ў калгасы 45 проц. гаспадарак прыгарадных сельсаветаў

Перавыканаем заданьні калгаснай вясны

Віцебскі раён ліквідаваны. 12 сельсаветаў былога Віцебскага раёну адышлі к гораду, пад непасрэднае кіраўніцтва гарадзкога пралетарыяту, які павінен дапамагчы акаляючай горад вёсцы ўстаць на шлях сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

У гэтую вясеньнюю пасеўную кампанію перад горадам стаіць грандыёзьнейшая задача калектывізаваць акаляючае сельска-гаспадарчае насельніцтва ня менш як на 45 проц. усіх гаспадарак, адыйшоўшых к гораду вёсак. Гэта наша мэта, к якой мы павінны імкнуцца, але гэта ня значыць, што трэба насільна заганяць сялян у калгасы і паўтараць тую ж памылку, якая, з-за «галавакружэньня ад посьпехаў» была дапушчана некаторымі арганізацыямі ў мінулую пасеўную кампанію.

Ці ёсьць у нас прадпасылкі і ўмовы к таму, каб выканаць намечаны процант калектывізацыі?

Так, ёсьць. Бядняцка-серадняцкая часьць насельніцтва, хаця і хістаецца, але ўжо канчаткова, назаўсёды і беспаваротна рашыла, што для яе застаўся адзіны шлях ісьці ў калгас і калектыўнай працай парваць закалдаваны круг жабрацтва і недахопаў, якія заўсёды акалялі і акаляюць дробную індывідуальную гаспадарку.

Батрак, бядняк і серадняк стаяць на раздарожжы. Яны нік ня могуць самастойна вырашыць пытаньне „з кім ісьці і каго слухаць“. З аднаго боку яны бачаць бурны рост дасягненьняў калгасаў, з другога боку яны яшчэ кой-дзе знаходзяцца пад уплывам кулацтва, якое запугвае іх, распускаючы самыя брудныя нябыліцы аб тым, што «калгасы — гэта другі прыгон, у якім бальшавікі мацней старых памешчыкаў сядуць на шыю селяніна і будуць над ім зьдзеквацца», «абагульваюць жаных жонак, дзяцей» і г. д. Трэба яшчэ многа ўмоў, каб канчаткова ўпэўніць селяніна ў нялепасьці гэтага паклёпу і разьбіць кулацкую агітацыю, на практыцы паказваючы селяніну ўсе выгады вядзеньня калектыўнай гаспадаркі.

Кулак яшчэ не разьбіты і працягвае плесьці свой хітры ланцуг паклёпу і пагроз, якім, як павуцінай, апутвае вёску. У вёсках былога Віцебскага раёну кулацкая агітацыя асабліва моцна дае сябе адчуваць. Пасланыя гаркомам для правядзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі рабочыя брыгады і члены бюро гаркому, выкрылі амаль ў кожным сельсавеце брыдкасьнейшыя прыклады праваапартуністычнай практыкі ў падатковай палітыцы.

Ва ўсіх дванаццаці, адышоўшых к гораду, сельсаветах маецца давоні такі моцная праслойка эканамічна моцных кулакоў, якія па нейкіх прычынах злічаны ў бедняк і амаль зусім вызвалены ад падатку.

У Віцебскім сельсавеце дагэтуль былі абкладзены індывідуальна толькі два кулакі. „У Вас больш няма кулакоў“—заявілі члены сельсавету разам са старшынёй. Але пры беглым наглядзе падатковых картак выявілася, што ёсьць мацнейшыя кулакі, маючыя ад 9 да 14 дзесяцін зямлі, па дзесяціне і больш таварных фруктовых садоў і гародаў, па 3—5 галоў буйнае рагатае жывёлы, па 2—3 коні, на якіх займаюцца круглы год ізвозам, здаюць у арэнду памяшканьні (дачы), эксплёатуюць нелегальна наёмную рабочую сілу, і такія гаспадаркі плацілі ад 20 да 70 рублёў падатку ці зусім былі вызвалены ад падатку. Нягледзячы на тое, што такія гаспадаркі мелі яскравы капіталістычны характар, яны былі занесены ў сьпіскі маламоцных ці бядняцкіх гаспадарак. На першых-жа сходах беднаты брыгадам гаркому ўдалося выявіць дзесяткі такіх гаспадарак у кожным сельсавеце. Па аднаму Віцебскаму сельсавету выяўлена 16 такіх эканамічна і палітычна кулацкіх гаспадарак, якія зьяўляліся мацнейшым тормазам у разьвіцьці калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Брыгады гаркому вядуць упартую і цьвёрдую работу па падрыхтоўцы да другога бальшавіцкага севу па калектывізацыі і загатоўках усіх відаў прадуктаў. На 31 сакавіка арганізаваны ўжо 7 новых калгасаў, уцягнута ў новыя і старыя калгасы 330 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і ёсьць усе прадпасылкі к таму, што ў раёне дзейнасьці гарсавету і гаркому партыі к пачатку вясеньняга севу будзе ўцягнута ў калгасы ня менш 45—50 проц. сялянскіх гаспадарак.

Плян вясеньняга севу будзе і павінен быць выканан, ня гледзячы на тую „спадчыну“, якую гарком партыі і гарсавет атрымалі ад адпаведных арганізацый былога Віцебскага раёну. А атрымалі мы тое, што плян сева да двара поўнасьцю не даведзены, плян кантрактацыі па калгасах дагэтуль выканан у сярэднім толькі на 65 проц., ня кажучы пра індывідуальны сэктар, у якім кантрактацыя амаль зусім не праводзілася. Рост калгасаў за апошні час быў зусім спынен і толькі пасьля прыезду брыгад у вёску работа значна ажывілася і ёсьць усе асновы к таму, што пад кіраўніцтвам гарадзкога камітэту партыі 12 сельсаветаў Віцебскага раёну па бальшавіцку правядуць другі бальшавіцкі сеў, выканаўшы і перавыканаўшы ўсе вытворчыя заданьні.

З прыгавору выязной сэсіі нарсуда па справе Сьвятчанка

У час абвостранай клясавай барацьбы, ліквідацыі кулацтва як клясы на базе суцэльнай калектывізацыі, пры наяўнасьці шалёнай злобы і агітацыі капіталістычных элемэнтаў—клясавых ворагаў, адчайным іх супраціўленьні мерапрыемствам партыі і савецкай улады, вясною 1930 г. на абшарах Нікалаеўскага сельсавету, пад кіраўніцтвам актыв'стага, прадстаўніка лепшай часткі батрацкай, бядняцка-серадняцкай часткі вёскі, Андрэя Сьвятчанка арганізаваўся калгас «Колас».

Азьвярэлае кулачччо, раскулачанае на базе суцэльнай калектывізацыі, іх прыхільнікі, застаўшыяся на абшарах Нікалаеўскага сельсавету ў асобе Марозава, Собалева, Загацкага Пятра, падпявалы клясавых ворагаў мясцовы настаўнік — сын папа Дзьяканаў і былы царскі чыноўнік, прайдоха Тамашоў, вельмі хітра стварылі ўмовы для прыпыненьня далейшага росту калгасу „Колас“, пачалі дзейнічаць, каб убраць з шляху новага будуючагася жыцьця Андрэя Сьвятчанка і гэтым самым затрымаць далейшае разьвіцьцё арганізаванага калгасу.

Прадстаўнік райкалгассаюзу, інструктар рэвізор Гліндзіч, кіруючыся выключна заданьнямі крымінальнага вышуку, на падставе зьвестак, атрыманых ад клясава-чуждых элемэнтаў, скатваўся з правільнага шляху, пайшоў па лініі найменшага супраціўленьня, зьвязаўся са сваім знаёмым Дзьяканавым чужым элемэнтам і зьвем кулака—Марозавым і ім падобнымі і ў сваіх вывадах паказаў, што ў калгасе маюцца небясьпечныя злачынствы ў выніку злоўжываньняў Сьвятчанка.

З за бяздушнага падыходу рэвізора, нячуласьці органаў дазнаньня лепшы арганізатар калгасу Андрэй Сьвятчанка аказаўся на лаве падсудных.

Судовае сьледзтва з бясспрэчнай яскравасьцю ўстанавіла, што Андрэй Сьвятчанка аказаўся ахвярай чарговай вылазкі клясавых ворагаў, скарыстоўваўшых пасобныя памылкі Сьвятчанка, якія ня могуць быць разгледжаны як крымінальныя злачынствы.

На судзе ўстаноўлена, што калгас, ня гледзячы на розныя цяжкасьці і недахоп рабочых рук, перавыканаў свой пасеўны плян; што з 6 сямей маецца на сёньняшні дзень 33 сям'і; што такім чынам калгас расьце, разьвіваецца, узмацняецца прылівам новых членаў з беднякоў і серадняком.

Суд нічога злачыннага ня ўгледжвае ў наліччы некаторых родзічаў Андрэя Сьвятчанка ў калгасе. На судовым сьледзтве ўстаноўлена поўная адсутнасьць сямейнасьці і сваяцкага пачуцьця з боку Андрэя Сьвятчанка да яго братоў.

Продаж некаторай колькасьці масла пэрыядычна на працягу 2—3 месяцаў на прыватным рынку ў час цяжкога напружанага фінансавага становішча калгасу, продаж нягодных для калгасу канфіскаваных будынкаў, спажываньне некаторай колькасьці жывёлы для членаў калгасу ў страдны час і продаж жывёлы выбракаванай і ня годнай для калгасу, таксама не зьяўляецца крымінальным злачынствам, хаця фармальна Андрэй Сьвятчанка павінен быў мяса здаць спажыўкааперацыі, тое, што ён часта не складаў адпаведных актаў, можна тлумачыць толькі нявопытнасьцю яго ў вядзеньні рахункаводзтва.

Ніякай растраты абвінавачваемы Сьвятчанка не зрабіў. У канечным выніку высьвятлілася яго памылка з-за няправільных дзеяў рахункода Піскунова. Продаж сэпаратара і малатаркі выклікана была гаспадарчай неабходнасьцю. За лік іх куплена новая моцная малатарка.

Несвоечасовая ўборка аўса і сенакосу тлумачыцца адсутнасьцю рабочых рук, дажджлівым надвор'ем і адсутнасьцю дапамогі з боку райкалгассаюзу, але авёс упасьледку быў убраны з некаторым процантам сапсаваньня.

На падставе вышэйвыкладзенага, суміруючы ўвесь дабыты на судовым сьледзтве матарыял, суд знайшоў прад'яўленае абвінавачваньне Андрэю Сьвятчанка па 196, 197 і 204 арт. арт. КК недаказаным, а таму, кіруючыся п. 1 арт. 326 КК, **прыгаварыў**: абвінавачваемага Сьвятчанка Андрэя Андрэевіча лічыць па суду **апраўданым**. Меру прасячэньня—падпіску аб нявыезьдзе—адмяніць.

УСІМ РАЁННЫМ ГАЗЭТАМ

ЦКК КП(б)Б, Наркамзем, Калгасцэнтр і газэта «Зьвязда» пачынаюць генэральную праверку падрыхтаванасьці БССР да другой бальшавіцкай вясны.

Праверка пачнецца з 2-га і працягнецца да 20 га красавіка.

Праверка павінна выявіць падрыхтаванасьць калгасаў, саўгасаў, МТС і сёнешніх аднаасобнікаў да сяўбы, ход кантрактацыі, давядзеньне пасеўных плянаў да калгасаў і двароў аднаасобнікаў, ход калгаснага будаўніцтва, стварэньне насенных, страхавых і фуражных фондаў, гатоўнасьць цягавай сілы і інвэнтару да сяўбы.

Баявая падрыхтоўка да сяўбы павінна выклікаць новы прыліў у калгасы, забясьпечыць пашырэньне пасеўнай плошчы, узмацніць калгасы—гэтыя буйныя калектыўныя гаспадаркі, якія дадуць нашай сацыялістычнай прамысловасьці сырэц, а рабочым харчы.

Правядзеньне ў жыцьцё пастаноў 6-га ўсесаюзнага зьезду саветаў і 3 га зьезду калгасаў БССР, укараненьне зьдзельшчыны і прыкладная арганізацыя працы ў калгасах—павінны ўзьняць яшчэ на большую вышыню прадукцыйнасьць працы ў калгасах.

Ваша задача—зараз-жа ўключыцца ў праверку, разгарнуць шырокую работу па мабілізацыі партыйных, прафсаюзных, савецкіх і ўсіх грамадзкіх арганізацый вакол задач праверкі.

Усе рабселькоры раённых газэт павінны быць мабілізаваны для непасрэднага ўдзелу ў праверцы і ўключыцца ў барацьбу за другую бальшавіцкую сяўбу.

Увесь раённы нізавы друк павінен мабілізаваць увагу калгасьнікаў і батрацка-бядняцка серадняцкіх мас аднаасобнікаў на ліквідацыю недахопаў у падрыхтоўцы да веснавой сяўбы.

Генэральнай праверцы ЦК КП(б)Б надае асабліва значэньне. Таму, не аслабляючы барацьбы за выкананьне ўсіх відаў загатовак, ваша работа на бліжэйшы час павінна быць падпарадкавана задачам генэральнай праверкі.

Культпроп ЦК КП(б)Б.

МАЦНЕЙ УДАР ПА КУЛАКУ

Вясна ўступае ў свае правы... Да пачатку вясеньняга севу засталіся лічаныя дні, а пагэтаму ў самы кароткі тэрмін нам трэба зрабіць усё магчымае, каб убраць з шляху калектывізацыі і другога бальшавіцкага севу ўсе перашкоды наступацельнаму руху другой бальшавіцкай вясны.

Галоўным тормазам у выкананьні вытворчых праграм вясеньняга севу і пляну калектывізацыі зьяўляюцца кулацтва і яго саюзнікі з лягеру правых апартуністых, якія ня хочуць бачыць шкодніцкай дзейнасьці кулакоў і прыкрываюць іх брудныя махінацыі.

Кулацтва азьвярэла і ўсімі сіламі спрабуе сарваць нашы мерапрыемствы па правядзеньні вясеньняга севу. Кулакі ня грэбуюць аніякімі сродкамі і кідаюцца на ўсе хітрыкі абы дзе небудзь прарваць фронт бальшавіцкага наступу, і там, дзе апартуністычна паслаблен наступ на кулака, ім часткова ўдаецца прарваць наш фронт і пашкодзіць справе калектывізацыі.

Бядняцка-серадняцкая часьць насельніцтва ўжо асэнзала, што адзіным і нязьбежным шляхам перабудовы сельскай гаспадаркі зьяўляецца шлях калектывізацыі. Але гэтую здаровую сьвядомасьць кулакі спрабуюць утапіць у моры бруднага паклёпу, пагроз і нават гвалту. Яны знадворку і знутры спрабуюць падарваць работу існуючых калгасаў з тым каб скампрамэтаваць іх у вачох аднаасобнікаў.

Калі гэта ім не ўдаецца, дык яны прыбягаюць к дапамозе сваіх «прыхільнікаў»—апартуністых усіх масьцей і іхнымі рукамі робяць сваю брудную сараву. А пагэтаму не выпадкова тое, што ў былым Віцебскім раёне маюцца такія калгасы, якія за 5—10-гадовы тэрмін свайго існаваньня не змаглі ўцягнуць у сваю сям'ю ніводнага аднаасобніка. Напрыклад, у Бараўлянскім сельсавеце ёсьць калгас, арганізаваны яшчэ ў 1918 годзе, у якім дагэтуль маецца ўсяго 8 гаспадарак. За 13 год свайго існаваньня гэты калгас ня змог уцягнуць у свае рады ніводнага аднаасобніка. Гэта тлумачыцца тым, што ў калгас пралезлі кулакі, якія трымаюцца там толькі для таго, каб скампрамэтаваць ідэю калектывізацыі ў вачох акаляючага насельніцтва.

Але гэтага мала. Подласьці, хітрасьці і зьверству кулакоў няма межаў. Калі ім не ўдаецца ўзяць той ці іншы калгас пад свой уплыў, дык яны пры дапамозе правых апартуністых спрабуюць разграміць гэты калгас і тэрарызаваць калгасьнікаў і іх прыхільнікаў аднаасобнікаў, якія хочуць уступіць у калгас.

Справа тав. Сьвятчанка найбольш яскрава раскрывае нам вочы на шкодніцкую дзейнасьць кулакоў і іх прыхільнікаў - апартуністых, накшталт Іўчанка, інструктара калгассэкцыі Гліндзіча, начальніка міліцыі Гаралевіча і т. п. элемэнтаў, якія дапамаглі кулакам убраць з іх шляху аднаго з лепшых арганізатараў і кіраўнікоў калгаснага руху.

Калгас «Колас», арганізаваны ў мінулым годзе т. Сьвятчанка, пад яго ўмелым кіраўніцтвам адразу змог стаць на правільны шлях і паказаць аднаасобнікам усе выгады вядзеньня калектыўнай гаспадаркі ў параўнаньні з нерэнтабельнасьцю дробнай індывідуальнай. У кароткі перыяд гэты калгас з 6 ці гаспадарак вырас да 33 і мае аграмаднейшыя шансы на тое, каб згуртаваць вакол сябе ўсю бядняцка-серадняцкую часьць акаляючага яго насельніцтва. Кулакі з усёй ярасьцю і шаленствам абрушыліся на гэты калгас і яго кіраўніка тав. Сьвятчанка. Яны сплялі вакол яго такую брудную сетку паклёпу і тэрору, што судзьдзя Іўчанка і падобныя яму людзі з сьледчых работнікаў не змаглі разглядзець скрозь свае апартуністычныя акуляры ўсіх махінацый кулацтва і пасадзілі тав. Сьвятчанка на 6 год з строгай ізаляцыяй. Толькі дзякуючы ўмяшацельству «Віцебскага Пралетарыя», была разаблачона брудная дзейнасьць кулакоў, і тав. Сьвятчанка звернуты на свой баявы пост сацыялістычнага будаўніцтва вёскі.

«Віцебскі Пралетары» дабіўся перагляду гэтай справы і ў выніку другі суд пад бальшавіцкім кіраўніцтвам судзьдзі **Шубіна** ня толькі поўнасьцю апраўдаў т. Сьвятчанка, але і змог адкрыць вочы ўсім, акаляючым калгас, аднаасобнікам на подлую антыкалгасную дзейнасьць кулакоў. «Я адмаўляюся абвінаваць падсуднага па ўсіх артыкулах Крымінальнага Кодэксу, якія врыпісалі т. Сьвятчанка» — заявіла на судзе пракурор г. Віцебску т. Сокалава.

Суд і прысутнічаўшыя на паўторным працэсе да таго былі абураны чарговай вылазкай кулацтва і апартуністычным рашэньнем першага суда, што тут жа пасьля працэсу быў стыхійна арганізаваны мітынг пратэсту супроць кулацкага тэрору. **У адказ на гэты тэрор тут-жа на мітынгу пасыпаліся новыя заявы аднаасобнікаў аб уступленьні ў калгас. Калгасьнікі далі сваё слова па-бальшавіцку правесьці вясеньні сеў і ня толькі выканаць, але і перавыканаць яго праграму. Яны тут-жа высунулі сустрэчны плян вясеньняга севу, павялічыўшы ранейшы плян на 25 проц. і стварылі ўдарную брыгаду свае імя «Віцебскага Пралетарыя».**

Паўторны суд канчаткова змыў з тав. Сьвятчанка брудную пляму бандыта, дэзэртыра і растратчыка, якую яму наляпілі кулакі і судзьдзя Іўчанка. Нявінна прасядзеўшы два месяцы ў турме, Сьвятчанка не астыў к барацьбе за калектывізацыю. Актыўна працуючы членам сельсавета, ён зноў разьяжджае па вёсках і арганізуе новыя калгасы, яшчэ і яшчэ даказваючы сваю адданасьць савецкай уладзе і партыі ўсямернай дапамогай яе мерапрыемствам па калектывізацыі.

Тав. Сьвятчанка апраўданы, але гэтага мала. Неабходна з усёй сілай рэвалюцыйнай законнасьці ўдарыць па антысавецкай дзейнасьці кулакоў і іх вольных ці нявольных дапаможнікаў—правых апартуністых. Трэба зараз-жа аддаць пад суд усіх, хто спрабаваў разваліць і разваліў было калгас «Колас» і наладзіць над імі такі паказальны працэс, які-б паказаў усім кулакам, як савецкая ўлада можа караць сваіх унутраных ворагаў, якія становяцца на шляху яе разьвіцьця.

У гэтую вясеньнюю пасеўную кампанію кулакі, як ніколі, паднялі галаву і ўзмацнілі сваю антысавецкую дзейнасьць. Мы зараз маем весткі, што ва ўсіх сельсаветах былога Віцебскага раёну кулакі заварушыліся каб сарваць калектывізацыю, кантрактацыю, пашырэньне плошчы і іншыя мерапрыемствы другога бальшавіцкага севу. У адказ на гэтыя кулацкія махінацыі рабочыя Віцебску, пад кіраўніцтвам гаркому партыі, павінны дапамагчы перадавой частцы вёскі арганізаваць магутны прыліў аднаасобнікаў у калгасы з тым, каб к прадстаячаму пленуму ЦК КП(б)Б давесьці процант калектывізацыі вёскі ў акаляючых горад сельсаветах да 50 проц. замест 35 намечаных па пляну.

Гэта будзе найлепшым адказам на контррэвалюцыйныя вылазкі клясавага ворага і канчатковым ударам, які мы павінны нанесьці кулацтву.

Н. Баруноў.

ДАЦЬ ЖОРСТКІ БОЙ КЛЯСАВАМУ ВОРАГУ

(З працэсу тав. Сьвятчанка)

Адчуваючы сваю блізкую згубу, кулацтва аказвае шалёнае супраціўленьне сацыялістычнаму наступу. Яно аддае ўсе свае сілы на тое, каб сарваць грандыёзьнейшую праграму сацыялістычнай будоўлі. Кулацтва, скарыстоўваючы сваіх агентаў у партыі правых і «левакоў», агульнымі сіламі дзейнічаючы за адно—імкнуцца нашкодзіць правядзеньню ўсіх мерапрыемстваў партыі і ўраду.

З адбыўшагася суду па справе **Сьвятчанка** асабліва ясна відаць імкненьне кулацтва накіраваць сваю зброю супроць лепшых перадавых барацьбітоў за сацыялістычную перабудову вёскі.

Група азьвярэлых кулакоў і іх агентаў—**Тамашоў, Дзяканаў, Собалеў, Марозаў, Загацкія** не маглі спакойна глядзець, як расьце і мацнее на іх вачох калгас «**Колас**». Гэтая група кулацтва паслала свайго агента Тамашова ў калгас каб той разваліў яго, але гэта не ўдалося. За тое ўдалося скарыстаць міліцыю Віцебскага раёну і свайго агента-апартуністага **Іўчанка**, які не зразумеў, «што кулакі самыя зьверскія, самыя грубыя, самыя дзікія эксплёататары, ня раз аднаўляючыя ў капіталістычных краінах уладу абшарнікаў, цароў, папоў і капіталістых» (Ленін).

Судзьдзя Іўчанка падпаў пад кулацкую агітацыю і паверыў усім тым паклёпам кулакоў, якія з пенай у роце імкнуліся разваліць калгас.

Брыгада «Праўды» і «Віцебскага Пралетарыя» ускрыла ўсе хітрыкі кулацтва і зараз перад намі ўскрываецца малюнак агіднейшых спраў.

25 га сакавіка ў калгасе «Колас» адбылося паседжаньне выязной сэсіі суда, пад старшынствам т. **Шубіна**, пры грамадзкім абвінаваўцы пракуроры г. Віцебску т. **Сокалавай** па перагляду справы старшыні калгасу т. Сьвятчанка.

Фармальна па бухгальтарскі

Сьведка **Гліндзіч** сваімі паказаньнямі, як нельга лепш, выявіў кулацкую махінацыю і хітрыкі Тамашова, Дзяканава і іншых. Гліндзіч правод'іў рэвізію ў калгасе і замест дэталёвага высьвятленьня становішча яго, павярхоўна паглядзеў справы і сваёй рэвізіяй як нельга лепш стварыў глебу для кулацкага нападу. Гліндзіч вытвараў рэвізію з дапамогай Дзяканава сына папа і сьвядома замазаўшы ўсе дасягненьні калгасу і актыўнага арганізатара яго т. Сьвятчанка у сваёй кулацкай заяве надаў суду такія вынікі, па якіх судзьдзя Іўчанка хутка задаволіў просьбу азьвярэлага кулацтва, пазбавіўшы т. Сьвятчанка волі на 6 год.

На запытаньне старшыні суда, як праводзілася рэвізія—фармальна па-бухгальтарскі, ці клясава, Гліндзіч адказаў:

— Фармальна па бухгальтарскі, бо я трымаўся паперкі крымвышуку.

Зграя абнаглеўшага кулацтва

У выступленьнях зграі кулацтва ўвесь час наглядалася імкненьне падарваць устоі калгасу, дыскрэдытаваць яго лепшых прадстаўнікоў. Асабліва гэта відаць было з выступленьняў Собалева.

— Я Сьвятчанка,—кажа ён,—ведаю з нядобрага боку. Я нават чуў, што Сьвятчанка быў бандытам, дэзэртырам, канакрадам. У калгас я не пайду, хачу яшчэ паглядзець, як там будуць працаваць» (галасы з месц: «Мы ня прымем»).

У выступленьнях іншых кулакоў **Марозава, Загацкага** адчувалася, што ўсю зброю яны накіроўваюць на Сьвятчанка выключна з-за таго, што ён раскулачваў кулакоў і дабіўся таго, каб зрабіць калгас «Колас» узорным.

Што казалі калгасьнікі

Сьведкі калгасьнікі характарызавалі старшыню калгасу т. Сьвятчанка, як актыўнага арганізатара, барацьбіта за калектывізацыю, прыняўшага актыўны ўдзел у змаганьні з кулацтвам. Калгасьнікі Маторына, Марозава і іншыя казалі, што Сьвятчанка іх угаварыў пайсьці ў калгас і паказаў сапраўдны шлях да жыцьця. «Пасьля арышту нашага старшыні, казалі калгасьнікі,—кулачча ўгачыствавала. Яно над намі зьдзекавалася, сьмяялася, кажучы: «вашага праўдзіра пасадзілі, хутка і вас пасадзяць».

Сьведкі—аграном Яцкевіч і іншыя расказалі суду, што першай ластаўкай у арганізацыі калгасу «Колас» быў т. Сьвятчанка. У лютым 1930 г. арганізаваўся калгас з 6 гаспадарак і да восені 1930 г. у калгас улілося яшчэ 18 гаспадарак. У час перагібаў, пад кіраўніцтвам Сьвятчанка, калгасьнікам удалося ня толькі ўтрымаць, але і ўцягнуць яшчэ новых беднякоў і серадняком. Да канца восеньнага севу калгас налічваў ужо 24 гаспадаркі. Першая бальшавіцкая вясна прайшла па ўдарнаму. Калгасьнікі перавыканалі пасеўныя пляны. Уборачная кампанія таксама праведзена ўдарнымі тэмпамі, але ў зьвязку з недахопам цягавай і рабочай сілы засталося на полі некалькі коп аўсу і сена.

„Ад абвінавачваньняў адмаўляюся“

Пасьля выступленьня сьведкаў, з вялікай прамовай выступіла грамадзкі абвінаваўца т. **Сокалава**. Значную частку сваёй прамовы тав. Сокалава адводзіць пытаньням рашучай барацьбы з кулацтвам, канчатковага выкарчоўваньня капіталістычных элемэнтаў на вёсцы. Далей яна спыняецца на справе т. Сьвятчанка. «У адносінах недбайнасьці і разбазарваньня,—кажа т. Сокалава,—я адмаўляюся абвінавачваць т. Сьвятчанка па 204 арт. КК. У адносінах 197 арт. КК я лічу, што з боку т. Сьвятчанка былі дапушчаны памылкі, але не крымінальнага парадку.

Заканчваючы свае слова, т. Сокалава кажа, што адмаўляецца абвінавачваць т. Сьвятчанка па ўсіх артыкулах, што суд абвінавачваемага апраўдае, а тым, хто імкнуўся сарваць нашы пляны будаўніцтва, падарваць устоі калгасу—суд дасьць па заслугах.

На мітынгу

Пасьля суда адбыўся мітынг з удзелам усіх прысутнічаўшых сялян і рабочых завода. Прыгавор суда быў спатканы бурнымі воплескамі. У адказ на подлую хлусьню і дзейнасьць зграі кулацтва тры бядняк падалі заяву ў калгас. Калгасьнікі на мітынгу выступалі з нябачаным энтузіязмам, ухваляючы рашэньне пралетарскага суда, зварочваліся да ўсіх сялян з заклікам аб уступленьні ў калгасы.

Выступіўшы на мітынгу судзьдзя т. **Шубін** адзначыў, што рабочая кляса, разам з сялянствам, ідзе гіганцкімі крокамі наперад. Кулакі з скуры лезуць вон, каб сарваць грандыёзьнейшыя пляны пяцігодкі. Ім трэба даць бой.

Калгасьніца **Яфрэменка Марфа** проста, але надзвычайна яскрава абмалявала жыцьцё і працу ў калгасе. Скончыла яна сваю прамову заклікам яшчэ больш упарцей змагацца з кулацтвам, спаткаць ва ўзброеньні вясновы сеў.

Камсамольцы абвясьцілі сябе ўдарнікамі ў правядзеньні другой бальшавіцкай вясны і арганізавалі ўдарную брыгаду імя «Віцебскага Пралетарыя».

Тав. **Сокалава** адзначыла, што толькі дзякуючы кіраўніцтву камуністычнай партыі, яе ленінскага ЦК, мы дабіліся буйнейшых перамог у сацыялістычным будаўніцтве. Трэба яшчэ больш разгарнуць работу з беднатой, абнаглеўшаму кулацтву даць рашучы адпор.

Выступіўшы т. **Сьвятчанка** казаў: «Сёньняшні суд даў мне яшчэ больш энтузіязму і сілы, якія я аддам на будаўніцтва калгасу. Я яшчэ больш рашуча павяду барацьбу супроць кулацтва. Мінулы суд выканаў волю кулацтва. Кулачччо з задавальненьнем сустрэла прыгавор, даўшы мне 6 год пазбаўленьня волі, але іх забава ня доўга цягнулася. Наш пралетарскі суд сапраўды па бальшавіцку падышоў да справы і мы ўсе, як адзін, павінны даказаць, што толькі калгас дае сапраўды новае жыцьцё. Мы яшчэ больш павінны павесьці барацьбу з абнаглеўшым кулацтвам».

Позна ўначы калгасьнікі разыходзіліся кожны з думкамі, імкненьнямі па-бальшавіцку правесьці вясновы сеў, разьбіць нахабную атаку кулацтва.

Брыгада «Віцебскага Пралетарыя»
Сурганаў і Войцэхіна.

Тав. Аранштам у Віцебску

На адкрыўшуюся ўчора выгадную партканфэрэнцыю Н-скай авіабрыгады прыбыў начальнік палітніўніцтва БВА тав. Аранштам.

Віцебск уключыўся ў двухдэкаднік праверкі падрыхтаванасьці да севу

Віцебскі гарком КП(б)Б уключыўся ў правядзеньне двухдэкадніка генэральнай праверкі раёнаў БССР да сяўбы. Створаны штаб, куды ўваходзяць: ад гаркому партыі—т. **Чычэраў**, КК РСІ—т. **Вензель**, рэдакцыі «Віцебскі Пралетары»—**Рубінштэйн**, гаркому КСМ—**Казлоў**, прафарганізацыі—**Рубін**, гарсавету—**Залецкі** і старшыні райкалгассаюзу і райкаапсаюзу. Штаб прыступіў да працы.

НАДЫХОДЗЯЧЫЯ ПЕРАВЫБАРЫ БЮРО ЯЧЭЕК

УВЯЗАЦЬ З ПАЧЫНАЮЧАЙСЯ ПРАВЕРКАЙ ВЫКАНАНЬНЯ РАШЭНЬНЯЎ ПРАВЕРТРОЕК ПА ЧЫСТЦЫ ПАРТЫІ

Рэалізаваць пастанову ЦК УсеКП(б)

У надыходзячай справаздачна-перавыбарчай кампаніі кіруючых органаў, вытворчых парткалектываў і ячэек важнейшай задачай зьяўляецца праверка выкананьня дырэктыў партыі аб павароце партарганізацый тварам да вытворчасьці, праверка, наколькі кожная паасобная ячэйка здолела перабудаваць сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі забесьпячэньня бязумоўнага і поўнага выкананьня прамфінпляну па ўсіх паказальніках. Падрыхтоўчая работа да перавыбараў і справаздачна-перавыбарчая кампанія павінны мабілізаваць партыйныя масы на неадкладную, **поўную рэалізацыю пастановы ЦК УсеКП(б)** аб партыйнай і масавай рабоце ў цэху і брыгадзе.

У гэтай пастанове даюцца выразныя канкрэтныя дырэктывы па актуальнейшых пытаньнях партыйнай і масавай работы на вытворчасьці, накіраваныя на далейшае павышэньне ролі і ўдзелу партыйных арганізацый ва ўсім гаспадарча-палітычным жыцьці прадпрыемстваў. Праведзеная ў асноўным перабудова партработы на прадпрыемстве патрабуе далейшага ўдасканаленьня, далейшага паляпшэньня і канкрэтызацыі кіраўніцтва з боку парт'ячэек вытворчым жыцьцём, такой расстаноўкі партыйных сіл, якая забясьпечвала-б больш шырокі партыйны ўплыў на работу асноўных нізавых вытворчых зьвеньняў, у якіх у канчатковым ліку вырашаецца выкананьне прамфінпляну.

ЦК УсеКП(б) сваёй пастановай патрабуе ад партыйных арганізацый поўнага выкананьня дырэктыў XVI партзьезду аб пагалоўным удзеленьні ўсіх камуністаў і камсамольцаў у сацспаборніцтве і ўдарніцтве. Інакш і быць ня можа. Кожны камуніст, кожны камсамолец на прадпрыемстве павінен у першую чаргу падаваць узоры камуністычных адносін да працы.

Зараз, як правіла, амаль на кожным прадпрыемстве парткалектывы лічаць, што партыйцы і камсамольцы на 100 проц. ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. На справе-ж на некаторых прадпрыемствах ня ўсе партыйцы і камсамольцы працуюць сапраўды ўдарнымі мэтадамі, жаць і лічацца ўдарнікамі. Самаправерка сапраўднага выкананьня, узятых абавязкаў у парадку сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінна быць сыстэмай у рабоце вытворчых партарганізацый. Трэба рашуча весьці барацьбу з ілжэ-ударніцтвам, у першую чаргу сярод камуністаў і камсамольцаў, забясьпечваючы гэтым самым далейшае пашырэньне і замацаваньне сацыялістычных мэтадаў працы на прадпрыемствах.

Арганізуючы актыўнасьць і творчую ініцыятыву мас на вытворчасьці, партыйныя арганізацыі павінны забясьпечваць сваёй работай поўнае **праведзеньне адзінаначальля**, весьці барацьбу з усякімі скажэньнямі дырэктыў партыі ў гэтым пытаньні. **«ЦК прапануе ліквідаваць і ў будучым не дапускаць арганізацыі розных «штабаў» і «надзвычайных камісій» пры парткомах і ячэйках, што падмяняе гаспадарчае кіраўніцтва і яго аперацыйна-тэхнічныя функцыі і зьяўляецца грубым парушэньнем адзінаначальля».**

Пытаньне аўладаньня тэхнікай, якая «у пэрыяд рэканструкцыі вырашае ўсё»—важнейшая задача. На рэалізацыю гэтай дырэктывы, на аўладаньне тэхнікай вытворчасьці, партыйцамі і камсамольцамі, усімі рабочымі і кіруючымі кадрамі прадпрыемства павінна быць мабілізавана ўся пралетарская грамадзкасьць і выкарыстаны ўсе магчымасьці на месцах. Павышэньню вытворчай кваліфікацыі рабочых і кіруючых кадраў, рацыяналізацыі тэхнічнай рэканструкцыі, мабілізацыі творчай актыўнасьці мас на пасьпяховае выкананьне ўсіх вытворчых задач павінна быць падпарадкавана ўся работа партыйных арганізацый на прадпрыемстве.

У адпаведнасьці з задачамі перанясеньня цяжару масавай работы ў нізавыя вытворчыя зьвеньні, трэба ўсюды правесьці разбуйненьне цэхавых ячэек і пашырыць сетку парт груп. Асаблівую ўвагу павінны ад даць вытворчыя партарганізацыі задачам паляпшэньня абслугоўваньня вячэрніх і начных зьмен, забясьпечваючы гэтыя зьмены кіруючымі кадрамі з таварышоў, якія цьвёрда праводзяць у сваёй рабоце генэральную лінію партыі. Арганізацыйная перабудова партзьвеньняў павінна быць закончана ў самы бліжэйшы тэрмін. Поўнае завяршэньне перабудовы партыйнай работы на вытворчасьці, у адпаведнасьці з пастановай ЦК, барацьба па выкарчоўваньні апартуністычнай практыкі—зарука далейшых посьпехаў у змаганьні за выкананьне прамфінпляну, за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады.

(«Зьвязда»).

Аб выніках пленуму ЦК КП(б)Б і рашэньнях прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б)

Рэзалюцыя пленуму Віцебскай гарКК РСІ

Пленум гарКК КП(б)Б поўнасьцю ўхваляе рашэньні прэзыдыуму ЦКК УсеКП(б) і пленуму ЦКК КП(б)Б, якія накіраваны на пасьпяховае выкананьне трэцяга рашаючага году пяцігодкі, скончаньне пабудовы фундаменту сацыялістычнай эканомікі СССР, рашучую барацьбу з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі і адзначае, што дадзеная ацэнка прэзыдыумам ЦКК УсеКП(б) поўнасьцю пацьвярджаецца становішчам работ гарКК КП(б)Б.

Ня гледзячы на маючыйся пералом у працы гарКК КП(б)Б па актывізацыі мас і ўцягненьні іх у працу КК, аднак рашэньне пленуму гарКК ад 25 сьнежня 1930 г. поўнасьцю яшчэ ня выканана.

Выходзячы з вышэйпаказаных рашэньняў, пленум прапануе наступнае:

1. Зрабіць агляд выкананьня дырэктыў праверкомаў па чыстцы партыі, пад пунктам погляду канкрэтнага ўдзелу ячэек цалком у барацьбе з усялякімі ўхіламі ад генэральнай лініі партыі і за выкананьне прамфінпляну, аўладаньне тэхнікай, мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў і г. д. і ўдзелу кожнага партыйца ва ўдарніцтве, сацспаборніцтве і барацьбе за выкананьне прамфінпляну.

2. Пленум канстатуе невыкананьне прамфінпляну за асобны квартал большасьці прадпрыемстваў і невыкананьне прамфінпляну за студзень—люты месяцы, пры наяўнасьці ўсіх умоў дзеля выкананьня і прапануе прэзыдыуму ў красавіку месяцы зрабіць агляд ходу выкананьня прамфінпляну, выяўленьне прычын прарываў і паставіць гэтае пытаньне на пленуме гарКК.

3. Пленум адзначае недастатковы рух у разгортваньні крытыкі і самакрытыкі па Віцебску, пасьля аб'яднанага пленуму гаркому і гарКК, прапануе прэзыдыуму яшчэ больш зьвярнуць увагу на разгортваньне самакрытыкі і праз два месяцы праверыць пераламленьне дырэктыў аб'яднанага пленуму ГК і ГКК на прадпрыемствах і ўстановах.

4. Адзначаючы зусім слабае становішча шэфства прадпрыемстваў над савецкім апаратам, наяўнасьць правааапартуністычных адносін з боку некаторых трыкутнікаў, пленум прапануе правадзіць месячнік шэфства, дабіцца рашучага пералому і больш рашуча змагацца з правапартуністычнымі настроямі да выкананьня пастановы 16-га зьезду партыі адносна шэфства над савапаратам, для чаго прэзыдыуму прыцягнуць да гэтай працы ўсіх членаў гарКК.

5. Адзначаючы, што ўвага грамадзкасьці да чысткі савапарату зусім паслабла, што чыстка праходзіла без папярэдняга агляду ўстановы, пленум прапануе прэзыдыуму чыстку савапарата скончыць да 1 жніўня 1931 г. і завастрыць увагу рабочай грамадзкасьці, асабліва шэфствуючых прадпрыемстваў над установамі, падлягаючых чыстцы, абавязковым папярэднім аглядам працы ўстановы. У бліжэйшы тэрмін праверыць выкананьне дырэктыў камісій па чыстцы тымі установамі, у якіх чыстка ўжо праведзена.

6. У сувязі з далучэньнем да гораду 12 сельсаветаў, пленум прапануе прэзыдыуму далейшую працу накіраваць на забясьпечаньне праведзеньня вясеньняй пасеўнай кампаніі, на абслугоўваньне вёскі, накіраваньне і інструктаваньне сэкцыямі РСІ, для чаго склікаць нараду старшынь сэкцый РСІ пры сельсаветах, прадугледзіць у пляне працы выезд як асобных членаў прэзыдыуму, так і прэзыдыуму цалком па асобных пытаньнях.

7. Пленум прапануе прэзыдыуму ў бліжэйшы тэрмін праверыць выкананьне дырэктыў і пастаноў пленуму і прэзыдыуму гарКК.

8. Адзначаючы слабую працу бюро скаргаў, пленум прапануе выканаць дырэктыву прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б аб узмацненьні працы бюро скаргаў з ускладаньнем абавязкаў масавай працы на загадчыка бюро скаргаў.

9. Адзначаючы зусім слабую працу «лёгкай кавалерыі» і адсутнасьць кіраўніцтва з боку гаркому КСМ, пленум прапануе разам з гаркомам КСМ ажывіць працу «ЛК» і пасіліць далейшае кіраўніцтва ёю.

10 Паставіць у бліжэйшы час на рабочых сходах прадпрыемстваў даклад аб выніках пленуму ЦКК КП(б)Б і аб праробленай працы „ГКК-РСІ.

АДСУТНАСЬЦЬ ВЯРБОВАЧНАЙ РАБОТЫ

ПА НАБОРУ Ў ВАЙСКОВЫЯ ШКОЛЫ ЁСЬЦЬ ЯСКРАВЫ ВЫРАЗ ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ ПРАКТЫКІ

Па бальшавіцку выканаць дырэктывы партыі і камсамолу аб камплектаваньні вайсковых навучальных установ

Камплектаваньне ваенных школ—справа ўсёй грамадзкасьці

Пытаньне аб падрыхтоўцы камандных кадраў уваходзіць складанай часткай у справу ўзмацненьня абароназдольнасьці нашай краіны, бо ад якасьці камандзіра залежыць якасьць вучобы і выхаваньне байца. Адсюль зразумела, чаму неабходна асаблівая ўвага адбору кандыдатаў у ваенныя школы.

Тав. Варашылаў на IX зьезьдзе камсамолу казаў: „Калі прыняць пад увагу, што будучая вайна будзе мэханізавана да апошніх межаў, што машыне ў гэтай вайне будзе належыць адна з галоўнейшых і рашаючых роляй, —дык стане зусім відавочным, што канец барацьбы будзе ў вялікай ступені залежыць ад уменьня найбольш прадукцыйна выкарыстаць гэтую машыну. Адсюль вынікае неабходнасьць асабліва востра ў данны момант паставіць пытаньне аб вылучэньні з свайго асяродку і аб адпаведнай падрыхтоўцы патрэбных нам ваенна-тэхнічных кадраў. Вось куды павінна быць накіравана наша ўвага ў першую чаргу".

Гэта выступленьне т. Варашылава яскрава сьведчыць аб значэньні падрыхтоўкі камандных кадраў стойкіх і адданых барацьбітоў, якія ў будучай вайне павядуць за сабою чырвонаармейцаў у бой.

У складзе прымаемых у ваенныя школы 50 проц. адводзіцца грамадзянскім арганізацыям, якія павінны забясьпечыць школы наступнай сацыяльнай праслойкай: 60 — 70 проц. рабочых, 20 проц. батракоў і калгасьнікаў, 15 проц. дзяцей рабочых і 5 проц. беднякоў і іншых сацыяльна блізкіх нам груп. Апрача таго, склад прымаемых павінен мець 30 проц. партыйцаў і 50 проц камсамольцаў.

Для выкананьня ўсіх гэтых задач неабходна шырока разгарнуць растлумачальную работу па прадпрыемствах, скарыстоўваючы друк, сходы, мітынгі, гутаркі і г. д.

Зараз у Віцебску праводзіцца агляд становішча рабочага шэфства над Чырвонай арміяй. Неабходна гэты агляд увязаць з адборам лепшых маладых рабочых у ваенныя школы, і вакол вярбоўкі ў ваенныя школы павінна быць мабілізавана ўвага ўсёй пралетарскай грамадзкасьці.

Вайсковыя часткі гарнізону свае заданьне па вярбоўцы ў ваенныя школы перавыканалі ў 5 — 8 разоў. Лепшыя байцы адабраны ў ваенныя школы.

Трэба выклікаць садружэскія прадпрыемствы на сацыялістычнае спаборніцтва па вярбоўцы ў ваенныя школы і адстаючых узяць на буксір.

Важнасьць камплектаваньня ваенных школ павінна быць уяўлена ўсімі і вярбоўка павінна праходзіць ударнымі тэмпамі.

Вейлін.

Дабіцца ўдарнай работы па вярбоўцы ў ваенныя школы

Асабліва важную ролю ў справе камплектаваньня ваенных школ павінен адыграць камсамол.

Між тым, трэба канстатаваць, што на сёньняшні дзень па Віцебску мы вынікаў належных у гэтай галіне ня маем.

Большасьць калектываў і ячэек КСМ („Дзьвіна", «Чырвоны мэталіст», Лекерт, шчотачная фабрыка і акулярная) не вялі растлумачальнай працы па вярбоўцы рабочай моладзі ў ваенныя школы і нягледзячы на тое, што бюро гаркому прапанавала гэтым калектывам не пазьней 25 сакавіка закончыць вярбоўку ў ваенныя школы, гэта пастанова яшчэ ня выканана.

На 30 сакавіка ўсяго ў ваенныя школы запісалася толькі 28 чал.

Невыкананьне пастановы гаркому аб вярбоўцы ў ваенныя школы кажа аб тым, што некаторыя камсамольскія ячэйкі забыліся аб тым, што камсамол зьяўляецца шэфам ваенна-марского і паветранага флёту.

Гэтыя школы павінны быць забясьпечаны дастатковымі кадрамі з камсамольцаў і, наогул, з рабочай моладзі. Неабходна дабіцца сапраўднай ударнай работы ячэек камсамолу па вярбоўцы камандных кадраў у ваенныя школы.

Асевіч.

Поўнасьцю выканаць плян

Рэалізацыя лётарэйных білетаў 5-й лётарэі ТДА-авіяхэму дасьць дзяржаве на ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны 25 млн. руб. Тыражы лётарэі будуць праводзіцца, пачынаючы з красавіка. Першы тыраж адбыўся 28 сакавіка. Па Віцебску трэба распаўсюдзіць на 62 тысячы руб. білетаў але Віцебскі гарсавет высунуў сустрэчны плян і абавязаўся рэалізаваць білетаў на 90 тысяч руб.

Рабочая грамадзкасьць і ўсе члены ячэек ТДА-авіяхэму павінны максымум увагі ўдзяліць распаўсюджваньню білетаў 5-й лётарэі ТДА-авіяхэму.

Ніводнага прадпрыемства і ўстановы, ніводнага рабочага, служачага, вучня, студэнта, не павінна застацца без білетаў 5-й лётарэі ТДА-авіяхэму.

Поўным выкананьнем кантрольных лічбаў па рэалізацыі білетаў лётарэі ўзмацнім абароназдольнасьць савецкага саюзу.

Мацулевіч.

На дырыжабль „Клім Варашылаў"

Жэит № 3 арганізаваў брыгаду па правядзеньні месячніка па збору ўцільсыравіны і мэталялому. Брыгада ў складзе тт. **Варабейчык, Шостак, Бапер, Файтэльсон, Астраўлянскай, Прус, Звоккінай і Сівакс** сабрала мэталялому 760 кгр. і грошы, атрыманыя за яго, перададзены ў карысьць пабудовы дырыжабля «Клім Варашылаў».

Шостак.

На пабудову эскадрыльлі „Камсамолец"

У адказ на заклік гарбюро ДКА да піянэраў гораду аб зборы грошай на пабудову эскадрыльлі «Камсамолец», піянэратрад пры вопытна-практыкавальнай школе будаўнікоў уносіць 3 р. 37 к. на пабудову эскадрыльлі і выклікае пасьледваць гэтаму прыкладу атрад пры школе будаўнікоў і ўсе атрады гораду.

Праверыць наведваньне школ

Партыя рашуча паставіла пытаньне перад усімі партыйнымі ячэйкамі аб 100-проц. ахопе членаў і кандыдатаў партыі партвучобай. Але зрыв заняткаў у шэрагу партшкол, ненаведваньне многімі партыйцамі палітшкол, камвузу і г. д. кажа аб тым, што з боку некаторых партыйцаў маецца недаацэнка партвучобы. Некаторыя партыйныя калектывы і ячэйкі не звярочваюць належнай увагі на гэта пытаньне і недастаткова кіруюць партшколамі, нават маюцца такія факты, калі некаторыя партыйныя калектывы (завод «Ноўка») не рэагуюць на тое, што вылучаныя партыйцы для кіраваньня партшколай зрываюць заняткі. Партыйцы, не наведваючыя партшколу, ня прыцягваюцца да партыйнай адказнасьці і нават праверка наведваньня партыйцамі партшкол не праводзіцца.

Яшчэ горш абстаіць справа з палітшколамі камсамольскімі. Партыйныя калектывы і ячэйкі павінны зараз заняцца гэтым пытаньнем, праверыць наведваньне партыйцамі палітшкол і лёзунг партыі аб 100-проц. ахопе партыйцаў партвучобай павінен быць цалком выканан. Партыйцы, адмаўляючыяся ад заняткаў, павінны быць прыцягнуты да суровай партыйнай адказнасьці.

Наумскі.

Прыкладна скончылі падрыхтоўчую палітшколу

21 сакавіка ў „Пралеткіно" адбыўся выпуск 23 работніц рызьзёвай базы Белуціля, скончыўшых першую падрыхтоўчую палітшколу пры лесазаводзе № 13. Хаця пры камплектаваньні школы было завербавана 148 чалавек, але пры сканчэньні аказалася ўсяго 42. З гэтай колькасьці 23 чал.—работніцы рызьзёвай базы. Астатнія ў працягу 6 месячнай вучобы дэзэртыравалі з культурнага фронту, некаторыя яшчэ ня зусім уявілі важнасьць палітвучобы. Памяшканьне для заняткаў не адпавядала свайму прызначэньню, нават ня было стала, адсутнічалі сшыткі, часта лектары прыходзілі на заняткі непадрыхтаванымі і ня было точнага часу заняткаў. Замест прызначаных двух гадзін, займаліся значна меньш.

Ня гледзячы на гэтае, рызьзёвая база ўсё ж выпусьціла 23 чалавек, прыкладна скончыўшых школу, пры чым асабліва трэба адзначыць ударную брыгаду з тт. Аманава, Кавалёва і Чарняк, якія добра праявілі сябе як на вытворчасьці, так і на вучобе. Усе выпускнікі былі прэміраваны ячэйкай і фабкомам, і перададзены ў вячэрнюю партшколу і тут жа на выпуску абвясьцілі сябе ўдарнікамі па далейшай вучобе.

Канцапольскі.

Партвучоба сарвана

На гуце «Ноўка» з пачатку навучальнага году былі арганізаваны дзьве школы па партвучобе: двухгадовая саўпартшкола, якая была ўкамплектавана 40 таварышамі, і адзіная партшкола, якой было ахоплена 35 таварышоў. Двухгадовая партшкола не працавала на працягу трох заняткаў, а адзіную партшколу наведваюць 5 — 4 асобы. Парткалектыў пытаньнем зрыву заняткаў ня цікавіцца, а з другога боку зрыву заняткаў спрыяе і тое, што ў дні вучобы праводзяцца розныя сходы, паседжаньні і г. д. Камсамольская школа з-за адсутнасьці кіраўніка таксама не працуе. Вылучаныя кіраўнікі камсамольскай школы т. т. Саўчанка і Зілін адмовіліся ад кіраўніцтва школай, а парткалектыў ніякіх мер ня прымае да іх.

Сураскаму РК КП(б)Б трэба гэтым пытаньнем зацікавіцца.

Лявонці Шышно.

Спалохаліся працы

Школа вылучэнцаў пры гаркоме партыі зрабіла двухдзённы суботнік на чыгунцы па ачыстцы сьнега. З 54 маючыхся курсантаў не зьявілася толькі 6 чал., а менавіта Пістушовіч, Бізунова, Васкабойнік, Левіт, Валейчанка і Маліноўская, якія адпрацавалі ўсяго толькі адзін дзень, не зьявіўшыся на наступны, спалохаўшыся, відавочна, цяжкой працы.

Агульны сход курсантаў просіць партыйныя ячэйкі, у якіх састаяць пералічаныя таварышы, прыняць супроць іх адпаведныя меры.

По даручэньні сходу **Сурганаў.**

Адстаюць ад тэмпаў

На пабудове панчошна-трыкатажнага камбінату ёсьць партыйная ячэйка, ахопліваючая каля 200 рабочых. Ніякай работы па падрыхтоўцы к ленінскім дням партыйная ячэйка не праводзіла і вынікаў па вярбоўцы членаў партыі з лепшых рабочых няма. Пабудова перайшла на ўдарныя тэмпы, а партыйная ячэйка ні разу не паставіла на партыйным сходзе пытаньня аб ударніцтве і сацспаборніцтве.

Работа па ваенізацыі ячэйкай таксама не праводзіцца, хоць і былі прызначаны ваенныя заняткі, але яны сарваліся з-за таго, што партыйцы і камсамольцы не зьявіліся. Гэтакая слабая дысцыпліна і бязьдзейнасьць ячэйкі паказваюць на недастатковае кіраўніцтва з боку бюро.

Трэба ажывіць работу партячэйкі.

Рыгор Максімаў.

Камсамольская ячэйка не працуе

Некалькі разоў на фанэрным заводзе за поўную бязьдзейнасьць было распушчана бюро камсамольскай ячэйкі. Гэты урок партыйная ячэйка завода ня ўлічыла і належнай увагі працы камсамольскай ячэйкі не ўдзяліла, у выніку чаго і на сёньняшні дзень камсамольская ячэйка фанэрнага завода амаль не працуе.

Сходы склікаюцца рэдка, камсамольцы палітшколы не наведваюць, рост ячэйкі нязначны, на вытворчасьці яна зусім не адчуваецца.

Партыйнай ячэйцы трэба больш увагі зьвярнуць на пытаньне аздараўленьня работы камсамольскай ячэйкі, а гаркому камсамолу неабходна зацікавіцца становішчам ячэйкі.

Рабкор.

Ажывіць працу „лёгкай кавалерыі"

Пры ўсіх ячэйках КСМ гораду існуюць групы «лёгкай кавалерыі», але праца ў гэтых групах пастаўлена надта дрэнна. Калі некаторыя і працуюць, дык бясплянава, бязсыстэмна, самапёкам. Гэта таму, што няма ніякага кіраўніцтва з боку гарадзкога штабу „лёгкай кавалерыі".

Частка членаў штабу зусім ня хоча працаваць, тлумачачы сваёй перагружанасьцю на вытворчасьці (Бірвін — шчацінная ф-ка, Магергут—ф-ка «Лекерта», Басін—рабфак), а другая частка чакае. Да таго ж гарком КСМ вызваліў ад працы начальніка штаба т. Шульмана з прычыны таго, што яго абралі па калектыву КСМ («Чырвоны Мэталіст») і ня даў другога намесьніка.

Трэба зараж-жа зрабіць зрух у працы «лёгкай кавалерыі».

Л. Аліфсон.

За крытыку лаюць

Камсамольская ячэйка пры ЦРК зусім не працуе і не прымае ніякага ўдзелу ў вытворчым жыцьці. Сакратар ячэйкі т. **Фішэлевіч** ня цікавіцца працай ячэйкі.

Агульныя сходы заўсёды зрываюцца. Камсамольцы маюць запазычанасьць членскіх узносаў за 6—7 месяцаў. Нават член бюро ячэйкі т. **Хотзін** на працягу 6 месяцаў не плаціў членскія ўзносы, а сам сакратар за чатыры месяцы. Член бюро ячэйкі **Вожык** (24 га магазыну) паспрачалася ў час работы з работніцаў яўрэйкай і назвала яе «жыдоўкай». Ячэйка на чале з сакратаром гэтае пытаньне змазала. Усе палітычныя кампаніі (перавыбары саветаў, пасеўкампанія і інш.) праходзяць міма ячэйкі. Ячэйка ня кіруе піянэратрадам. У ячэйцы зусім не разгорнута крытыка і самакрытыка, і калі на агульным сходзе камсамолец Палякоў выступіў з крытыкай, дык сакратар ячэйкі яго тут-жа на сходзе абляяў. На сходзе таксама прысутнічаў сакратар камсамольскага калектыву ЦРК т. **Эпштэйн**, які ня даў адпору выступленьням сакратара ячэйкі.

Гарком камсамолу павінен зацікавіцца гэтымі фактамі.

Камсамолец.

Ліст у рэдакцыю

15-га лютага на куставым партсходзе ў клюбе краўцоў па дакладу т. Гурына аб рэканструкцыі транспарту я ў сваім выступленьні дапусьціў правааапартуністычныя фармулёўкі ў пытаньнях арганізацыі суботнікаў і заработнай платы на транспарце, што зьвяло маё выступленьне да недаацэнкі палітычнай ролі суботнікаў і грамадзкага буксіру і да ідэі ўраўнілаўкі ў заработнай плаце на транспарце,—гэтым самым я ўносіў дэмабілізацыю замест мабілізацыі на барацьбу за ўзьняцьце і палепшаньне працы транспарту. Адмяжоўваючыся ад гэтай часткі свайго выступленьня, як права-апартуністычнай і асуджаючы яе, лічу, што такія выступленьні ў данны момант жорсткай клясавай барацьбы зьяўляюцца шкоднымі, адбіваючы імкненьні і настроі адсталых груп працоўных і льлюць ваду на млын клясавага ворага, які ўсялякімі мерамі вядзе шалёную барацьбу супроць сацбудаўніцтва. Толькі рашучай барацьбой з адхіленьнямі ад правільнай ленінскай лініі партыі, толькі поўнай мабілізацыяй усёй партыі і рабочай клясы, партыя даб'ецца пасьпяховага выкананьня пяцігодкі за чатыры гады. Я, як і раней, так і ў далейшым буду змагацца за генэральную лінію партыі, супроць усялякіх адхіленьняў ад яе.

В. А. Кофман.

Швэйная ф-ка „Сьцяг індустрыялізацыі" павінна стаць узорнай

Пара пакончыць з бязладзьдзем, неарганізаванасьцю, няўвязкай у рабоце цэхаў і агрэгатаў. Забясьпечыць 100-проц. выкананьне прамфінпляну

Швэйная фабрыка «Сьцяг індустрыялізацыі»—буйнае дасягненьне народнай гаспадаркі Беларусі. Гэтая фабрыка—волат пабудавана і абсталявана па апошняму слову тэхнікі і зразумела, што яна павінна стаць узорнай, што ўсю працу яе, кожны недахоп, кожнае дасягненьне неабходна трымаць пад самым уважлівым і нясупынным наглядам грамадзкасьці.

Фабрыка хварэе

Зараз на фабрыцы працуюць брыгады Наркампраца і гарсавету, якія выяўляюць арганізацыю і ўмовы працы пад кутом погляду, наколькі забясьпечана 100 процантнае выкананьне прамфінпляну. Грамадзкая думка ўсіх рабочых фабрыкі непаслабна напружана і мабілізавана вакол пытаньняў выкананьня пляну. Штодзённа адбываюцца лятучыя сходы і нарады па злабадзённых пытаньнях аб ліквідацыі прарываў. Наведваемасьць і актыўнасьць рабочых гэтых сходаў сьведчыць аб цьвёрдым намеры выканаць прамфінплян. Паміж агрэгатамі ідзе сацспаборніцтва, лепшыя з іх ужо дасягнулі штодзённага перавыкананьня заданьня, упартая воля рабочых выканаць і перавыканаць—залог таго, што прамфінплян будзе выканан, але побач з гэтым, «Сьцяг індустрыялізацыі» хварэе шэрагам недахопаў. Лепшай адзнакай гэтага зьяўляецца ступень невыкананьня прамфінпляну. **У студзені недавыканана 57,4 проц., у лютым 38,1 проц і за першую палову сакавіка—32,8 проц.**

Пад шыльдай «арганізацыйнага пэрыяду» пануе бязладзьдзе

На фабрыцы яшчэ маецца шмат бязладзьдзя. Няма таго дня, каб ня было некалькі сходаў, альбо вытворчых нарад. На сходах уносяцца каштоўнейшыя, канкрэтныя прапановы рабочых, як палепшыць работу, ліквідаваць прарывы. А што з гэтага выходзіць? Пратаколы нарад маюць пастановы агульнага зьместу без практычных канкрэтных рашэньняў, ня фіксуюцца тэрміны выкананьня, не арганізаваны кантроль выкананьня, гінуць нескарыстанымі рабочыя прапановы, а бязладзьдзе «арганізацыйнага пэрыяду» фабрыкі працягвае панаваць.

Пад шыльдай таго-ж «арганізацыйнага пэрыяду» заходоўваецца бясплянавасьць работы ТНБ і БР. Разьдзел работы на дробныя апэрацыі для зноў уведзенай украінскай сыстэмы быў распрацованы габінэтна і зразумела, што выпраўленьне дапушчаных пры гэтым недахопаў і ўдасканаленьне ўсёй сыстэмы павінна праводзіцца шляхам плянавай сыстэматычнай праверкі, а часам масавага вырабу, але гэтым ніхто не займаецца. ТНБ і БР заняты дробязямі, «бягучымі справамі», а тым часам такія вузлавыя балючыя пытаньні, як арганізацыя працы інструктараў, наладжваньне рацыянальнай сыстэмы вытворчасьці, удасканаленьне ўведзенай сыстэмы па падзелу на апэрацыі застаюцца пакуль беспрытульнымі.

Вялікія прастоі і горы запасу

Што асабліва кідаецца ў вочы пры азнаямленьні з работай цэхаў—гэта вялікая колькасьць прастояў, значна зьніжаючая сярэднюю загрузку рабочага дню. То ў тым, то ў другім месцы агрэгату сядзяць па некалькі чалавек і чакаюць працы, тады як у іншых мясцох ствараюцца завалы непрапушчанага палуфабрыкату. Прычыны гэтых прастояў самыя разнастайныя, самыя часам недарэчныя, а ў агульным усё з-за таго ж бязладзьдзя. То несвоечасова пададзены матар'ял з закройнага цэху, з-за чаго прастойвае ўвесь першы участак пінжака, то па нейкай прычыне былі выняты 25 штук пінжачных карпусоў, а рукавы і іншыя дэталі да іх пайшлі апрацоўвацца далей, бо ня былі своечасова выняты, то не хапіла падкладак і горы вярхоў засталіся без пары, то пансаваліся адна альбо некалькі машын і прыходзіцца чакаць пакуль пачыняць. Рамонт машын не арганізаваны належным чынам, ня бывае ніводнага дню, каб у тым, альбо іншым агрэгаце ня было псаваньня машын, а ў выніку—затрымка ўсёй работы.

Асабліва жахлівае ўражаньне ў цэхах ствараюць горы пакінутага няскончанага палуфабрыкату. Тысячы штук прадукцыі ляжаць па некалькі дзён мёртвым капіталам, між тым як 2—3 простых апэрацыі досыць для таго, каб прадукцыя была скончана і накіравана ў склад. Такім чынам парушаюцца самыя катэгарычныя дырэктывы аб мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў, а **прычынамі ўсё тая-ж—бязладзьдзе і неарганізаванасьць працы.**

Прамфінплян даведзен да варштату аднабока

Прамфінплян у выглядзе штодзённых заданьняў даведзен да паасобных агрэгатаў, але зроблена гэта неяк аднабока. Даведзен да варштату толькі адзін паказальнік. Колькасьць канчатковай прадукцыі, і іншыя паказальнікі рабочым ня ведаюць. У выніку рабочыя не арыентуюцца ў пытаньнях унутранага жыцьця вытворчасьці. Так, **паказальнік па браку па пляну 0,3 проц., фактычны разьмер яго за студзень і люты 15,4%** (па касьцюмах). **2,8 проц. (па брюках).** Да ваогата гэтыя лічбы не даведзены. Грамадзкая думка на гэтым не мабілізавана. Вучот браку існуе толькі пры канчатковай прыёмцы прадукцыі, у працэсе вытворчасьці вучот браку не арганізаваны, а між тым брак ад закройнага цэху вельмі балючае пытаньне. 14-га сакавіка было патрачана шмат часу на выпраўленьне браку ад закройнай.

Фабрыка «Прафінтэрн» № 1, якая карыстаецца закройнай «Сьцягу індустрыялізацыі», неаднаразова ўзьнімала пытаньне аб тым, што ёй даюць папсаваны закрой. Вакол браку закройнага цэху неабходна скласьці грамадзкую думку.

Адзін толькі паказчык прамфінпляну выканан і нават перавыканан,—норма расходу сыравіны на адзінку прадукцыі. Так па касьцюмах запраэктавана норма 2,52 мэтра, а фактычна расходавана 2,46 мэтра. Тлумачыцца гэта тым, што пры складаньні прамфінпляну ня было ўлічана сустрэчная прапанова знізу, якая павінна была даць і фактычна ўжо дае аграмадную эканомію сродкаў. Рабочы-закройшчык прапанаваўшы гэтую рацыяналізацыю, да гэтага часу ня прэміраваны.

Пакончыць з неразьбярыхай

Вельмі адмоўнае зьявішча на фабрыцы—гэта нежаданьне старых рабочых дапамагчы маладым кадрам. «Вось прыйдзе інструктар, зьвярніся да яго»—адказвае старая работніца маладой на просьбу паказаць ёй нешта ў працы. Таксама не на належнай вышыні працдысцыпліна. Пасьля перапынку да працы зварочваюцца несвоечасова. Часты выпадкі прагулаў па неўважлівых прычынах, а асабліва выхадаў не на сваю зьмену, у выніку чаго на адной зьмене недахоп, а на другой лішак рабочай сілы.

Супроць усяго гэтага, належная барацьба не разгорнута ні ў напрамку адміністрацыйным, ні грамадзкім, растлумачальнай работы не вядзецца. Час узяцца за рашучую ліквідацыю ўсіх недахопаў, усіх хваробных месц, час пакончыць з бязладзьдзем «арганізацыйнага пэрыяду». Неабходна забясьпечыць 100-процантнае выкананьне прамфінпляну.

А. М.

Рыхтаваць кадры пралетарскага мастацтва

Больш увагі і дапамогі маладзёжнаму тэатру

Гэта было 4-га студзеня 1929 г. У маленькім памяшканьні гарбюро піянэраў сабралася невялічкая група піянэраў, якая паклала пачатак піянэрскаму тэатру. Было цяжка. Ня было ніякай дапамогі сродкамі, але неракаглі.

На чале з кіраўніком т. Бленам узяліся за працу, арганізавалі шумавы аркестр—гралі на бутэльках, на грэбенчыках і г. д. і, урэшце, з вялікімі цяжкасьцямі набылі сабе інструманты, частка якіх была куплена на свае сродкі. Піанэрыя Віцебску зацікавілася тэатрам, пачаўся прыліў. Кожны дзень прыходзілі дзесяткі піанэраў і ўпарта прасілі: «запішэце мяне ў тэатр»... і іх запісвалі...

І вось мінуў год і замест маленькага шумавога аркестру вырас вялікі спаяны калектыў, здольны паказваць здаровае і карыснае дзецям і піанэрыі відовішча. За год свайго існаваньня тэатр пасьпеў заваяваць сабе папулярнасьць ня толькі ў дзіцячай, але і ў дарослай аўдыторыі.

Вось, што кажуць аб тэатры рабочыя: «піанэр тэатр дысцыплінавасьцю і добра настаўленай працай заваяваў ня толькі юнага глядача, але і мас—дарослых рабочых». Ідучы ў ногу з жыцьцём, тэатр,—пішуць далей рабочыя,—свайё праграмай б'е на тых, з кім змагаецца наша партыя». Такіх водгукаў шмат. Ды і не дарэмна, бо тэатр шчыльна зьвязаў сваю працу з барацьбой за пяцігодку, за прамфінплян. Лодыра, прагульшчыка, лягуна—вось каго бярэ «на мушку» піанэр-тэатр.

Амаль кожны вечар, у кожным клюбе ставяць ня толькі «Гайку», але і жывыя газэты, часопісы, як-та «Пяць у чатыры» і г. д. Ставяць і вялікія п'есы, як «Шукацелі мазалей». Малыя «артысты» добра адбілі жыцьцё піанэраў і барацьбу за ўцягненьне ў рады піанэрыі неарганізаваных дзяцей. 6 разоў ставілася гэтая п'еса піанэртэатра ў клюбах і атрадах недарэмна грамадзкасьць Віцебску сумесна з піанэрыяй далі добры водгук на пастаноўку.

Вялізарнейшы посьпехам карысталася п'еса «Сапраўдная справа» з жыцьця замежнай піанэрыі. Гэтую п'есу ставілі каля 12 разоў.

П'еса «Лягавы» і «Гайнач» мелі таксама ня меншы посьпех. Добра былі настаўлены некаторыя жывыя газэты і часопісы. Перавыбары саветаў, прамфінплян, пяцігодка—вось што адбівал яны.

Не замыкаецца тэатр у рамках гораду. Піанэртэатр выяжджае ў калгасы, раёны. Не абмяжоўваючыся толькі «артыстычнымі» справамі, тэатр дапамагае і проста ў рабоце калгасаў: працуюць на полі, убіраюць і г. д.

Апроч гэтага, тэатр арганізоўвае чытальні і ленкуткі. Тэатр дапамагае атрадам гораду і вёскі ў наладжваньні іх мастацкай працы. Члены тэатру арганізоўваюць шумавыя аркестры, групы зацейнікаў і г. д. Удзельнічаюць члены тэатру і ў перадачы віцебскага радыё-трансляцыйнага вузла.

Бязумоўна, тэатр мае дасягненьні і дзіўна глядзець, як абураюча і на плявацельскі адносяцца да піанэртэатру паасобныя кіруючыя арганізацыі.

Памяшканьне, у якім знаходзіцца тэатр, узята з-пад крамы, нізкае, невялічкае, зусім не прыстасавана для тэатру. Асьвятленьне пакуль ёсьць, але трэба чакаць, што ток выключаць, таму што няма сродкаў, каб плаціць за яго. З грашыма, наогул, у тэатры справа кепская. Летась далі 400 руб., а сёлета зусім нічога ня далі.

Нічога ня робіць, каб дапамагчы тэатру, камсамол і бюро ДКА. Так сама ніякай увагі і дапамогі няма з боку прафарганізацый.

Тэатру трэба даць памяшканьне і сродкі. Прафарганізацыі, камсамол і бюро ДКА павінны павярнуцца тварам да тэатру.

І. Эйдлін, Аўэрыя.

Да першага паказу

Гэтымі днямі ў Белдзяржтэатры адбудзецца першы паказ маладзёжнага тэатру. Грамадзкасьць Віцебску добра ведае, як з шумавога аркестру ён вырас у піанэрскі тэатр, а потым з піанэрскага ў маладзёжны імя Макса Гельца.

Умовы, у якіх знаходзіўся тэатр, не давалі магчымасьці рыхтаваць гэты паказ. Часта зрываліся заняткі з-за адсутнасьці памяшканьня, ня кажучы ўжо аб сродках, але дзякуючы ўпартасьці маладых энтузіястаў, тэатр дабіўся перамогі.

Пастаноўка артыста БДТ-1 т. Галіна „На шляхох", якую рыхтуе тэатр, зьяўляецца першай пастаноўкай, у якой вельмі яскрава паказан кляссавы вораг—настаўнік, тлумачыўшы савецкую ўладу гістарычным непаразуменьнем. Шкодніцкім размовам дае руйнуючы адпор калектыў КСМ. На фоне гэтага і разгортваецца клясавая барацьба—вось асноўная тэма паказу.

Уся рабочая моладзь, усе школы, калектывы камсамолу павінны паглядзець паказ маладзёжнага тэатру.

Г. Магарас.

Ня прыслухоўваюцца да голасу піанэраў

Піанэрбрыгада сабю працмастацтва, якая павінна дапамагаць і сачыць за выкананьнем прамфінпляну, працаўнікамі тэатру, а таксама і за якасьцю іх працы, сустракае бюракратычныя адносіны і нежаданьне дапамагчы ў працы з боку кіраўнікоў тэатру.

Калі хто з брыгады хоча запытацца ў адміністрацыі тэатру, ці даць якую-небудзь параду, дык яны пасылаюць адзін да другога (як гэта зрабіў т. Груша). Апрача гэтага ў кіраўнікоў тэатру склалася думка, што піанэры ў іх працы нічым ня могуць дапамагчы.

Такім думкам трэба даць адпор.

Брыгада: **У. Шмідт, Г. Багданаў, Б. Барэнбаум.**

Студэнтаў пазбавілі магчымасьці хадзіць у кіно

Студэнтам Віцебску, паводле дагавору Наркамасьветы з Белдзяржкіно, дазволена наведваць кіно на 1-ы сэанс ільготна на 10 кап. за білет. І кіно «Мастацкі» і „Пралеткіно" парушаюць гэты дагавор. Ільготныя білеты касіры кіно студэнтам не прадаюць, кажучы, што норма ўжо распрадана, у той час, як на справе, пасьля сваёй «нормы» ў 30-50 ільготных праданых білетаў, касір прадае гэтыя білеты па 35—40 кап.

Хто зьвярне на гэта ўвагу?

Луч.

Дайце кіно-карціну, адпавядаючую сучаснасьці

Дзіцячы кіно-тэатр імя Макса Гельца яшчэ да сучаснага моманту не павярнуўся тварам да піанэрарганізацыі. Нядаўна ў кіно ставілася карціна „Стэнлей у пушчах Афрыкі", якая не адпавядае сучаснасьці і пабудавана выключна на прыгодах нейкага Джэна Кэмеруна. Гэтады, калі ў сучасны момант пралетарскім дзецям трэба было паказваць карціну, якая-б сапраўды адбівала жыцьцё сёньняшняга дню, барацьбу за калектывізацыю на вёсцы, за прамфінплян, за ўсеагульнае навучаньне.

Такія кіно-карціны, як «Стэнлей у пушчах Афрыкі» павінны быць зьняты і заменены другімі, адпавядаючымі сучаснасьці. Адміністрацыяй кіно нічога ня зроблена для культурнага абслугоўваньня дзяцей. Замест таго, каб пагуляць у шашкі, шахматы, ці іншыя гульні да пачатку сэансу, хлапцы бузацёраць, хуліганяць, кураць і г. д. Кіно-тэатр ня зьвязан з гарбюро ДКА, няма сувязі са школамі і атрадамі для наладжваньня калектыўнага наведваньня кіно-тэатраў.

Неабходна прыняць меры к аздараўленьню дзіцячага кіно-тэатру.

Ваўчок, Усыскін і Жапыскін.

Чаму гэта так?

28-га лютага ў «Пралеткіно» ішла карціна «Дачка двух бацькоў». Прысутнічаўшым на трэцім сэансе можна было заўважыць, што кіно-механік, пускаючы ленту, зьмяшчаў на экране толькі канцы слоўных надпісаў па беларуску, а таму на працягу ўсяго сэансу глядач мог чытаць надпісы выключна па расійску.

Неабходна высьветліць гэтую справу.

Глядач.

Гарадзкі сход партактыву

У суботу, 4-га красавіка, у памяшканьні гаркому КП(б)Б склікаецца сход партактыву гарадзкой партарганізацыі

На павестцы дню: вынікі ўсесаюзнай нарады па пытаньнях рабселькораўскага руху. Дакладчык т. **Дунец**—рэдактар газэты «Октябрь».

На сходзе павінны быць: члены гаркому КП(б)Б, гарВК і гаркому КСМ, члены фракцыі гарсавету і гарпрафсавету, члены бюро парт'ячэек, сакратары ячэек КСМ, члены рэдкалегій шматтыражак і насьценгазэт і рабкоры партыйцы.

Білеты атрымаць у гаркоме КП(б)Б.

Гарком КП(б)Б.

Супроць капіталу і яго слуг—рэлігійнікаў

Краіна саветаў уступіла ў пэрыяд разгорнутага сацыялістычнага наступу, у пэрыяд сацыялізму. Наступіўшы 1931 год—трэці год пяцігодкі будзе годам новых дасягненьняў. У гэтым годзе мы павінны завяршыць пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі СССР. Трэці рашаючы год пяцігодкі будзе зьяўляцца годам яшчэ больш абвостранай клясавай барацьбы.

Разгорнутае наступленьне сацыялізму на капіталістычныя элемэнты і крызіс капіталізму выклікае небясьпеку інтэрвэнцыі. І ў гэтай барацьбе пад дырыжорскую палачку сваіх гаспадароў, „сьвятыя" айцы, прадстаўнікі ўсіх рэлігій і рэлігійных арганізацый не застаюцца з боку, а адыгрываюць бадай першую скрыпку, як за мяжой, так і ў нашай краіне. Актывізацыя рэлігійных арганізацый, рост рэлігійнай рэакцыі заўсёды зьяўляецца вынікам росту буржуазнай рэакцыі, вынікам клясавага панаваньня эксплёататараў.

Тав. Ленін разглядаў рэлігію як «духоўную палку» буржуазіі, якая зьяўляецца дадаткам да ўсяго апарату прымушэньня. Рэлігія—«духоўная палка», якая ўсыпляе клясавую барацьбу, дапамагае буржуазіі замацаваць прыгнятасьць народных мас. Пагэтаму так ахвотна капітал прыбягае за дапамогай рэлігіі на ўсякі выпадак абвастраньня клясавай барацьбы. Айцы духоўныя ня гнушаюцца нічым, каб выканаць волю сваіх гаспадароў.

Работа папы рымскага, наступленьне главы англіканскай царквы — архібіскупа кентэберыйскага, работа Антонія Хрoпавіцкага ў Францыі, пазіцыя рабінаў Лёндану, Нью-Ёрку, Рыгі, Варшавы і інш. гарадоў, выступленьні патрыарха Пайпчёва-Славіі Варавы і шэрагу іншых, усё гэта накіравана да арганізацыі слаўутага крыжовага паходу супроць СССР і бальшавізму ўнутры капіталістычных краін.

Справа украінскай аўтакефальнай царквы ў працэсе СВУ, справа „скопчаскіх караблёў" у Ленінградзе, працэс над «фёдараўцамі» у ЦЧО, выкрыцьцё шпіёнскай арганізацыі ў Менску, Ленінградзе і Харкаве, што зьвёная падрыўная шкодніцкая работа рэлігійнікаў, фактычнае перараджэньне маліцьвеных дамоў у штабы ўнутранай контрэвалюцыі, барацьба супроць усіх мерапрыемстваў партыі і савецкай улады, удзел супольна з кулаком у падпалах і разгромах калгасаў, культустаноў і г. д.—усе гэтыя факты яскрава сьведчаць аб надзвычайнай актыўнасьці рэлігійнікаў, актыўнасьці палітычнай у справе падрыхтоўкі сумесна з інтэрвэнцыйнымі бандамі з-за мяжы, з меншавіцкімі, кантрарэвалюцыйнымі і іншымі контррэвалюцыйнымі шайкамі, разам з замежнай буржуазіяй інтэрвэнцыі супроць СССР.

Па прыкладу мінулых гадоў, рэлігійнікі ўзмацнёна рыхтуюцца да сьвяткаваньня «сьветлага васкрасеньня хрыстова» і яўрэйскага вялікадня. Рэлігійнікі ў дні сьвята сваімі прапаведзямі «міра і любві», «непраціўленьня злу», пропаведзямі „братства ўсіх", з дапамогай пышных набажэнстваў і казак пра „васкрасеньне хрыстова" і вызваленьне яўрэяў з-пад «рабства эгіпецкіх фараонаў»—паспрабуюць распаліць нацыянальнае пачуцьцё мабілізаваць сілы супроць клясавай барацьбы. Вось з якой ежай пойдуць рэлігійнікі ўсіх колераў да веруючых у дні сваёй «ударнай кампаніі». А рабіны, апрача гэтага, будуць яшчэ прапаведваць лёзунг «адзіненьне яўрэяў».

Вялікдзень рэлігійнікі паспрабуюць скарыстаць для распальваньня нацыяналістычнага пачуцьця, нацыянальнай абмежаванасьці, шавінізму, калі рэлігійнікі рознымі казкамі імкнуцца даказаць не існаваўшыя факты: „яўрэі абраны самім богам, яўрэі ядынайцеся"—кажуць рабіны. Яўрэі — хрыста-прадаўцы, яўрэі расьпялі спасіцеля і г. д.—кажа хрысьціянская рэлігія. Адсюль антысэмітызм, шавінізм, нацыянальная абмежаванасьць, што і патрэбна толькі былым пануючым клясам, з якімі змагаецца працоўны.

Вялікдзень у гэтым годзе—дзень мабілізацыі чорных сіл для інтэрвэнцыі супроць СССР. Менавіта ў гэты дзень рэлігійнікі ўсіх краін будуць заклікаць адсталыя масы на барацьбу супроць СССР да новай бойні:

С библией в карманах
С ружьями в руках
Марш христово войско
Сейте божий страх.
И когда от слова
Скуден будет всход
Пусть благие вести
Сеет пулемет.

Вось чаму ўсе працоўныя, поруч з барацьбой супроць усякай контрэвалюцыі, адначасова выступаюць супроць рэлігійнікаў і рэлігійных сьвят. Вось чаму працоўныя адмаўляюцца ад сьвяткаваньня вялікадня, як сьвята няволі, ніцтва і эксплёатацыі. Вось чаму працоўныя пропаведзям рэлігійнікаў супроцьпастаўляюць сваю клясавую пільнасьць і ўдарныя бальшавіцкія тэмпы барацьбы за прамфінплян, за праграму другой бальшавіцкай вясны, за выкананьне праграмы трэцяга рашаючага году пяцігодкі, за ўзмацненьне абароназдольнасьці савецкай краіны. У шэрагу працоўных не павінна быць ніводнага прагульшчыка наогул і ў вялікдзень, у прыватнасьці.

Супроць капітала і яго слуг—рэлігійнікаў!

Супроць рэлігіі, за пралетарскую культуры!

За выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады!

С. Шчуцкі.

Сьвята савецкай нафтапрамысловасьці

Нафтавая прамысловасьць першая выканала пяцігадовы плян, завяршыўшы яго ў два з паловай гады.

Прывітаньне т. Сталіна работнікам „Азнафты" і „Грознафты"

Вітаю рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал Азнафты і Грознафты з выкананьнем пяцігодкі ў два з паловай гады

З перамогай, таварышы!

Няхай жывуць рабочыя СССР, разьбіўшыя ланцугі капіталізму і стаўшыя гаспадарамі краіны.

Няхай жыве савецкая ўлада, няхай жыве партыя бальшавікоў!

Яз. Сталін.

Ордэны Леніна „Азнафце" і „Грознафце"

Прэзыдыум ЦВК СССР прыняў пастанову, адзначаючую з вялікім задаваленьнем посьпех гэраічнай барацьбы рабочых мас нафтапрамысловасьці, вылазіўшыйся ў выкананьні нафтавай пяцігодкі ў два з паловай гады.

Гэтыя дасягненьні,—гаворыцца ў пастанове,—маюць аграмаднае значэньне, як факт перамогі рабочае клясы ў барацьбе за эканамічную незалежнасьць, за выкананьне пяцігадовага пляну народнай гаспадаркі Саюзу ССР раней намечанага тэрміну, за сацыялізм.

Адзначаючы творчую ініцыятыўную і самаадданую работу азербайджанскага і грозьненскага пралетарыяту, прэзыдыум ЦВК пастанавіў нагародзіць ордэнамі Леніна: 1) азербайджанскую нафтавую прамысловасьць — „Азнафта" з усімі яе прадпрыемствамі, 2) грозьненскую нафтавую прамысловасьць „Грознафта" — з усімі яе прадпрыемствамі.

За асоба вылучную работу, праяўленую ў барацьбе за выкананьне пяцігадовага пляну нафтавай прамысловасьці ў два з паловай гады, нагароджаны таксама ордэнамі Леніна 55 асоб з ударнікаў рабочых, інжынэрна-тэхнічнага і адміністрацыйнага пэрсаналу па Азнафце і 35 асоб па Грознафце.

Барацьба францускіх гарнякоў

1-га красавіка павінна ўступіць у сілу рашэньне горнапрамыслоўцаў аб зьніжэньні зарплаты ўсім гарнякам Францыі. У сувязі з гэтым, унітарная рэвалюцыйная фэдэрацыя працы пастанавіла абвясьціць 24 гадзінную забастоўку пратэсту. У некаторых мясцох забастоўка абвешчана без абмежаваньня часу.

Рэфармісцкія прафсаюзы, вядучыя за сьпіной гарнякоў перагаворы з прадпрыемцамі, ужо два разы назначалі і адмянялі абвяшчэньне забастоўкі. Аднак, ва многіх мясцох шахцёры, прымыкаючыя к рэфармісцкім прафсаюзам, пастанавілі забаставаць, разам з рэвалюцыйнымі гарнякамі.

У некаторых горнапрамысловых акругах адбыліся дэманстрацыі гарнякоў і сутычкі з прыбыўшымі на шахты жандарамі.

Сацыял-дэмакраты Гейнсбэрга вышлі з с-д. партыі

БЭРЛІН, 30. Уся арганізацыя нямецкай сацыял-дэмакратычнай партыі ў горадзе Гейнсбэрг (Рэйнская вобласьць) заявіла аб сваім выхадзе з партыі ў знак пратэсту супроць галасаваньня сацыял-дэмакратычнай фракцыяй у рэйхстазе за асыгнаваньне на будаўніцтва браняносцаў.

Агляд сусьветнага эканамічнага крызісу

У Нямеччыне здабыча каменнага вугаля ўпала з 11560 тысяч тон у сьнежні 1930 году да 9794 тысячы тон у лютым 1931 году. Скарачэньне здабычы вугаля саправаджалася скарачэньнем збыту і павялічэньнем запасаў на складах. Вытворчасьць жалеза склала ў лютым 1931 году 520 тысяч тон супроць 615 тысяч тон у сьнежні 30 году. Лік новабудоўляў па 96 гарадох Нямеччыны скараціўся з 3358 у сьнежні 30 г. да 1895 у люты 1931 г.

Унешні гандаль Нямеччыны таксама працягвае скарачацца. Імпарт, склаўшы ў сьнежні 30 г. 707 млн. марак, зьнізіўся ў лютым да 605 млн. марак. Экспарт упаў з 825 млн. марак у сьнежні 30 году да 733 млн. марак у лютым 1931 году. Рост беспрацоўя ў Нямеччыне за 1-ы квартал 31 году выказаўся ў 623 тысячы чалавек і дасягнуў на 15 сакавіка гэтага году 4980 тысяч чалавек

Вядомы нямецкі статыстык Кучынскі паказвае, што рэальная зарплата нямецкага рабочага на 28 проц. ніжэй пражытачнага мінімуму.

У **Францыі** вытворчасьць чыгуна ў студзені панізілася на 9 5 проц., вытворчасьць сталі зьнізілася на 9 6 проц. Вытворчасьць вугаля ў студзені 31 г. складала 5 469.504 тон супроць 5.835 516 тон у студзені 30 году. Француская буржуазія імкнецца перанесьці ўсе цяжкасьці эканамічнага крызісу на плечы пралетарыяту. Ужо зараз лік поўных беспрацоўных складае ня менш 650 тысяч, а лік часткова беспрацоўных—каля паўтара млн.

У **Італіі** ў студзені—лютым 1931 г. выплаўка чыгуна складала 770 тыс. тон ці на 5 т. тон менш, чым за той-жа пэрыяд мінулага году. Сталі было выраблена за першыя два месяцы 1931 г. 231 тысяча тон — супроць 278 тыс. тон за студзень—люты 1930 г. Зварот унешняга гандлю за студзень і люты 1931 г. скараціўся на 1 мільярд 450 млн. лір. у параўнаньні з адпаведным пэрыядам мінулага году. Адначасова павялічваецца лік банкроцтваў. У студзені гэтага году меля месца 1573 банкроцтва—на 79 больш, чым ў сьнежні і на 359 больш, чым у студзені мінулага году. Па афіцыйных дадзеных, на 1 студзеня 31 г. лік зарэгістраваных беспрацоўных складаў 721 тыс. чалавек—на 255 тыс. больш, чым у студзені мінулага году.

У **ПАЗШ** аўтапрадукцыя ў першыя два месяцы 31 году складала ўсяго 391 тыс. машын супроць 603 тыс. тых-жа месяцаў 30 году. У Чыкага і іншых буйных цэнтрах пустуюць многія 20-павярховыя дамы, пабудаваныя для гандлёвых кантор. Унешні гандаль таксама працягвае падаць. У студзені экспарт складаў 250 млн. доляраў, а ў лютым — 226 млн. супроць 349 млн. у лютым 30 г. Грузазварот чыгунак скараціўся у сярэднім на 20% супроць сакав. 30 г. 31 год даў рэкордную колькасьць банкроцтваў. Абанкроціліся 33 6 прадпрыемстваў. Таксама надзвычайна абвастрыўся сельска-гаспадарчы крызіс. З мэтай паменшыць аграмадныя запасы хлеба і дабіцца павышэньня цэн на ўнутраным рынку, сельска-гаспадарчае кіраўніцтва прыступае к дэмпінгаваму экспарту ў 35 млн. бушэлей пшаніцы. Рост беспрацоўя ў 1 м квартале 31 году павялічыўся ў 3 4 разы ў параўнаньні з канцом 30 году. Міністр гандлю Ламонд прызнаў, што ў ПАЗШ 8 млн. беспрацоўных. Аднак, вядомы эканамісты прафэсар Фішэр, на аснове ўрадавых статыстычных дадзеных устанавіў, што ў канцы сакавіка лік беспрацоўных перавышаў 10 млн. чалавек.

Па дадзеных польскага кан'юнктурнага інстытуту, індэкс прампрадукцыі ў Польшчы паніжаўся ў студзені, праймаючы ўзровень за 25—27 гады за 100—95,5, а ў лютым ён зьнізіўся да 92 3. Мэталяапрацоўваючыя прадпрыемствы Цешынскай Сілезіі працуюць з 20 процантнай нагрузкай і скарыстоўваюць толькі 30 проц. нармальнага ліку рабочых. Рад тэкстыльных прадпрыемстваў скарацілі вытворчасьць на 50 проц. Па апошніх дадзеных, у Польшчы бязьдзейнічаюць 1104 паравозы з наяўных 5304 і 60 т. ваг. з наяўных 147 тысяч. Ня спыняюцца выпадкі банкроцтва прамысловых прадпрыемстваў, гандлёвых фірм і банкаў. Неперарыўна расьце беспрацоўе, дасягнуўшы на 1-га сакавіка, па афіцыйных далёка пераўменшаных дадзеных, 450 тысяч супроць 400 тысяч у лютым. У 30 годзе зарплата ўпала ніжэй узроўню 24-га году.

У **Англіі** экспарт за студзень і люты 31 году панізіўся на 40 міл. 700 тысяч фунтаў стэрлінгаў у параўнаньні з тым жа пэрыядам 30 году. Выплаўка чыгуна ў лютым ўпала да 320200 тон супроць 337200 у студзені. Лік дзейнічаючых доменных пячэй роўны толькі палове ліку дзейнічаўшых у лютым 31 году. Лік беспрацоўных на 16-га сакавіка, зарэгістраваных і атрымоўваючых дапамогу, складае 2,639.663.

Разьвіцьцё эканамічнага крызісу цягне за сабой далейшае пагоршаньне рабочае клясы і шалёнае наступленьне буржуазіі на зарплату рабочых ва ўсіх галінах прамысловасьці.

Агляд-самаправерка ўзмацніць нізавы друк у барацьбе за пляны 3-га рашаючага году

З мэтай павышэньня дзейнасьці нізавога друку ў барацьбе за пляны трэцяга рашаючага году, за генэральную лінію партыі, з мэтай карэннога палепшаньня ідэйнага і арганізацыйнага кіраўніцтва нізавым друкам з боку парт'арганізацый, культпропам ЦК КП(б)Б праводзіцца масавы агляд самаправерка нізавога друку і рабселькораўскага руху па 20 раёнах БССР.

Для правядзеньня масавага агляду-самаправеркі на Віцебску і прылягаючых да яго сельсаветах, гаркомам партыі, разам з рэдакцыяй «Віцебскага пралетарыя», створаны штаб у складзе 11 асоб і ў якасьці аб'ектаў, на якіх павінен будзе праводзіцца агляд-самаправерка, вызначаны наступныя газэты: шматтыражкі: «Мэтпрамавец», «Панчошніца», «Чырвоная акулярніца», «Факел друкара», «Молат» і «Дзьвіна», насьценгазэты: заводу «Камінтэрн», скурзаводу, шчаціннай фабрыкі, голкавай, шчотачнай, цюцюнавай, валасапрадзільнай, будаўніцтва новай панчошнай фабрыкі, інструмэнтальна мэблёвай фабрыкі і ф-кі гнутай мэблі; вясковыя газэты:—калгасу „1 га мая", саўгасу „Новы шлях" і камуны Добрыча.

Гэты агляд павінен будзе праўйсьці пад лёзунгам шырокай папулярызацыі рашэньняў усесаюзнай рабселькораўскай нарады, узмацненьня сыстэматычнага партыйнага кіраўніцтва нізавым друкам, мабілізацыі шырокіх рабселькораўскіх мас на барацьбу за другі бальшавіцкі сеў, за пасьпяховае выкананьне прамфінпляну на прадпрыемствах выяўляючы як адмоўныя бакі ў працы той ці іншай газэты, так і лепшыя прыклады, дапамагаючы канкрэтна выжыць выяўленыя недахопы і пераносячы лепшыя мэтады працы на іншыя газэты.

Усе партыйныя і грамадзкія арганізацыі павінны прыняць шырокі ўдзел у аглядзе-самаправерцы, шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, усямерна спрыяючы ўкараненьню ў рабселькораўскую працу лепшых форм і мэтадаў, як стварэньне рабселькораўскіх ударных брыгад, пастоў і г. д. Праводзімы агляд яшчэ больш узмацніць нізавы друк, узброіўшы яго лепшым вопытам, зробіць яго моцным барацьбітом за пляны трэцяга рашаючага году.

Склад штабу па правядзеньні агляду-самаправеркі нізавога друку

Ад гаркому партыі—тав. Рабіновіч, гарКК РСІ—тав. Жыцельзейф, ад рэдакцыі—тт. Лапіцкоўскі і Шульман, ад рабкораўскага актыву—тт. Дварсон, Войцэнка, курсы вылучэнцаў, т. Азонаў—дабраахвотнае пажарнае т-ва, т. Максімаў—будаўніцтва новай панчошнай фабрыкі, т. Паніш—Мэтпром, т. Эпштэйн—панчошная фабрыка, т. Мароззаў—камтрэст.

Інструкцыйная нарада штабу

Сёньня, 2-га красавіка, а 7 гадз. увеч., у памяшканьні рэдакцыі «Віцебскага Пралетарыя» (Палац працы, пакой № 40), склікаецца інструкцыйная нарада членаў штабу па правядзеньню масавага агляду самаправеркі нізавога друку з удзелам старшынь рэдкалегій: завода «Чырвоны мэталіст», панчошнай фабрыкі, фабрыкі «Дзьвіна», акулярнай, доўкарні «Камінтэрн», чыгуначнага вузла, завода «Камінтэрн», скурзавода, шчаціннай фабрыкі, голкавай, шчотачнай, цюцюнавай, валасапрадзільнай, будаўніцтва новай панчошнай фабрыкі, інструмэнтальна-мэблёвай і фабрыкі гнутай мэблі.

63-я гадавіна з дню нараджэньня Максіма Горкага

Палкае прывітаньне мільёнаў Максіму Горкаму

31 сакавіка споўнілася 63-я гадавіна нараджэньня Максіма Горкага. У сувязі з гэтым, па ўсяму СССР пракацілася хваля прывітаньняў вялікаму пісьменьніку ад рабочых і калгасных мас. Рэзалюцыі лятучых мітынгаў, пісьмовыя, тэлеграфныя прывітаньні заводаў і калгасаў прасякнуты гневам на пазору паклёпніцкай кампаніі буржуазіі супроць Горкага і няўхільнай воляй да далейшых перамог на шляху сацыялістычнага будаўніцтва.

Рабочыя і калгасьнікі адзначаюць дзень нараджэньня Горкага ўступленьнем за ўдарныя брыгады, называюць яго імем ударныя цэхі і бяруць на сябе абавязацельства павысіць вытворчасьць працы, змагацца з рэшткамі бяскультур'я.

На вяршыні барыкады

Правадыр францускай кампартыі Марсель Кашэн наступным чынам характарызуе той выбух прывітаньняў Горкаму, які выходзіць з мільёнаў мас працоўных Савецкага саюзу.

«Зараз, калі хуткімі крокамі наблізаюцца рашучыя баі паміж пралетарыямі і іх клясавымі ворагамі, М. Горкі заняў сваё месца на вяршыні барыкады, дзе разьвяваецца чырвоны сьцяг. Вось чаму працоўныя з гонарам сьвяткуюць 63-годзьдзе аднаго з іх-жа асяродку — рабочага, мастака, байца-наватара, даўшага бліскучыя ўзоры пралетарскай літаратуры».

За новага чалавека—рабочага і калгасьніка свабоднай краіны

Калгасьнікі Канцеміраўскага раёну (ЦЧО) заяўляюць Горкаму: «Вы ўмесьце з намі будуеце сацыялістычную грамаду, стварaючы новага чалавека. Новы чалавек нарадзіўся ў краіне будуючагася сацыялізму. Гэты новы чалавек—рабочы і калгасьнік вольнай краіны».

Прывітаньне 30.000 пралетарыяў „Красного Путиловца"

Пашыраны пленум агульна-завадзкой вытворчай нарады „Красный Путиловец" пры ўдзеле старых рабочых заводу—піша ў лісьце Горкаму: «31 тысяча чырвонапуцілаўскіх пралетарыяў у дзень твайго нараджэньня вітае ў тваёй асобе, дарагі Аляксей Максімавіч, цьвёрдага, непарушнага барацьбіта за лепшую камуністычную будучыню працоўных. Мы не дазволім буржуазіі зьдзекавацца над нашым любімым пісьменьнікам і пралетарскім трыбунам».

Пяцігодка ў дзейнічаньні Уралмашбуд

На здымку: Будаўніцтва электрастанцыі.

ПРЫКЛАДНЫ СТАТУТ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЕ АРЦЕЛІ

Канчатковы тэкст, прыняты Калгасцэнтрам, ухвалёны Народным Камісарыятам Земляробства СССР і зацьверджаны СНК СССР і Прэзыдыумам ЦВК СССР

I. Мэты і задачы

1. Батракі, беднякі і серадднякі паселішч раёну . . . .
. . . . дабрахвотна яднаюцца ў сельска-гаспадарчую арцель, каб агульнымі сродкамі вытворчасьці і агульнай арганізаванай працай пабудаваць буйную калектыўную гаспадарку і такім чынам забясьпечыць сапраўдную і поўную перамогу над кулаком, над усімі эксплёататарамі і ворагамі працоўных, сапраўдную і поўную перамогу над галечай і цемрай, над адсталасьцю дробнай індывідуальнай гаспадаркі і стварыць высокую прадукцыйнасьць працы і таварнасьць калектыўнае гаспадаркі.

II. Аб зямлі

2. Усе межы, што падзяляюць зямельныя надзелы членаў арцелі, зьнішчаюцца і ўсе палявыя надзелы зьліваюцца ў адзіны зямельны масыў, які знаходзіцца ў калектыўным карыстаньні арцелі.

Пры абагуленьні поўнасьцю ўсіх зямельных угодзьдзяў пакідаюцца ў індывідуальным карыстаньні прысядзібныя землі (гароды, сады і г. д.), прычым там, дзе гэта неабходна, паводле пастановы праўленьня арцелі і зацьверджэньня агульным сходам, зьмяняюцца разьмеры сядзібных зямель.

3. Адзіны зямельны масыў арцелі ні ў якім выпадку не павінен памяншацца. Надзяленьне выбыўшых членаў арцелі зямлёй за кошт зямельнай плошчы арцелі забараняецца. Выбываючыя з арцелі могуць атрымліваць зямлю толькі з вольных зямель дзяржфонду.

III. Аб сродках вытворчасьці

4. Абагульваюцца: уся рабочая жывёла, с.-г. інвэнтар, уся таварна-прадукцыйная жывёла, усе насенныя запасы, кармовыя сродкі ў разьмерах, неабходных для ўтрыманьня абагуленай скаціны, гаспадарчыя будынкі, патрэбныя для вядзеньня арцельнай гаспадаркі, і ўсе прадпрыемствы па перапрацоўцы. Жыльлёвыя будынкі членаў арцелі не абагульваюцца. Пры абагульваньні сельска-гаспадарчага інвэнтару пакідаецца ў асабістым карыстаньні членаў арцелі дробны сельска гаспадарчы інвэнтар, патрэбны для работ на прысядзібных землях.

З абагуленай рабочай жывёлы праўленьне арцелі, у выпадку патрэбы, выдзяляе мінімальна неабходную колькасьць коняй для абслугоўваньня асабістых патрэб членаў арцелі. У аднакароўных гаспадарках малочная жывёла не абагульваецца. У шматкароўных гаспадарках пакідаецца ў асабістым карыстаньні адна карова, рэшта абагульваецца. Племяньнікі, бяз'моўна, абагульваюцца. З абагуленай малочнай жывёлы ствараецца таварная арцельная гаспадарка. Абагульваньне дробнай жывёлы, г. зн. сьвіней і авец, праводзіцца ў раёнах развітай прамысловай жывёлагадоўлі па дробнай жывёле з пакіданьнем у членаў арцелі некаторае колькасьці дробнай жывёлы ў разьмерах, якія ўстанаўляюцца арцельлю. У раёнах непрамысловай дробнай жывёлагадоўлі сьвіньні і авечкі не абагульваюцца. Хатняе птаства не абагульваецца.

Побач з пакіданьнем у індывідуальным уладаньні дробнай жывёлы і птаства, калгасы арганізуюць прамысловую грамадзянскую дробную жывёлагадоўлю і птушніцтва.

У выглядзе страхоўкі ад неўраджаю і бяскорміцы, пры арцелі ствараюцца недатыкальныя насенныя і кармовыя фонды.

IV. Дзейнасьць арцелі

5. Праўленьне і ўсе члены арцелі абавязваюцца:

а) пашыраць засеўную плошчу шляхам выкарыстаньня зямлі, якая знаходзіцца ў распараджэньні арцелі, паляпшэньня і апрацоўкі кідомых зямель і правядзеньня ўнутрыгаспадарчага землеўпарадкаваньня;

б) поўнасьцю выкарыстаць на грамадзкіх асновах усю наяўную цягавую сілу, увесь інвэнтар, усе трактары, усе машыны, насеньне і інш. сродкі вытворчасьці; купляць на свае і пазычаньня сродкі трактары і другія сродкі вытворчасьці з мэтаю паступовага пераходу на мэханізаваную гаспадарку;

в) паставіць правільнае выкарыстаньне і дагляд за абагуленым жывым і мёртвым інвэнтаром, дабіваючыся таго, каб у калектыўнай гаспадарцы жывёла і інвэнтар былі ў лепшым стане, чым у індывідуальнай гаспадарцы;

г) паляпшаць ворныя і лугавыя землі і праводзіць агракультурныя мерапрыемствы, патрэбныя для падвышэньня ўраджайнасьці;

д) праводзіць заатэхнічныя і вэтэрынарныя мерапрыемствы, патрэбныя для хуткага ўзьняцьця і паляпшэньня таварнай жывёлагадоўлі і птушніцтва;

е) разьвіваць усе іншыя галіны сельскагаспадарчай вытворчасьці, дастасоўна да прыродных умоў месца, і саматужныя промыслы, адпаведна з умовамі раёну;

ж) арганізаваць будаўніцтва на грамадзкіх асновах гаспадарчых і грамадзкіх будынкаў і дапаможных устаноў;

з) павышаць культурна-палітычны ўзровень членаў арцелі;

і) усімі даступнымі мерамі паляпшаць бытавыя ўмовы членаў арцелі, у асаблівасьці жанчын і дзяцей.

V. Аб членстве.

6. Прыём у члены арцелі праводзіцца праўленьнем, якое ўносіць сьпіс новапрынятых членаў на зацьвярджэньне бліжэйшага агульнага сходу. Асабістая яўка для рабочых, якія пастаянна працуюць па-за арцельлю, не абавязкова.

7. У члены арцелі могуць уступаць усе працоўныя, якія дасягнулі 16 гадовага ўзросту.

У арцель ня прымаюцца кулакі і ўсе асобы, пазбаўленыя выбарчых правоў. Выключэньні з гэтага правіла дапускаюцца для членаў тых семьяў, у складзе якіх ёсьць аддаными справе савецкай улады чырвоныя партызаны, чырвонаармейцы і чырвонафлётцы, радавыя і камандны склад, сельскія настаўнікі і настаўніцы пры ўмове іх паручыцельства за членаў сваёй сям'і.

Гаспадаркі, якія перад уступленьнем у калгас забіваюць або прадаюць сваю жывёлу, ліквідуюць інвэнтар або злонамерна разбазарваюць насеньне, у арцель ня прымаюцца.

VI. Сродкі арцелі

8. Кожны ўступаючы ў арцель павінен унесьці грашовы ўступны ўзнос у разьмеры ад 2 да 10 проц. кошту ўсяе маёмасьці, як абагуленай, так і неабагуленай, якая прыпадае на яго долю ў двары, за выключэньнем рэчаў хатняга ўжытку асабістага карыстаньня

У выпадку, калі асноўнай крыніцай даходу ўступаючага ў арцель зьяўляецца заработная плата (агроном, настаўнікі, землеўпарадчык, служачыя ўстаноў і арганізацый, разьмешчаных у раёне арцелі і г. д.), разьмер узносу вызначаецца кожны раз праўленьнем, але ня можа перавышаць 10 проц. гадавога акладу.

Для батракоў устанаўліваецца ўступны ўзнос ня больш 5 руб. Рабочыя, пастаянна занятыя на рабоце па-за калгасам, звыш прадугледжанага статутам адлічэньня ва ўступны ўзнос ад 2 да 10 проц. кошту маёмасьці, адначасова ўносяць 3 проц ад гадавое зарплаты.

Заўвага. Звыш уступнага ўзносу арцель не патрабуе ад рабочага—члена арцелі якіх-небудзь дадатковых адлічэньняў з зарплаты.

Растэрміноўка выплаты ўступнага ўзносу можа быць дана праўленьнем толькі ў парадку і на тэрмін, які ўстанаўляецца калгасскам. Уступныя ўзносы залічваюцца ў непадзельны фонд арцелі.

9. З кошту абагуленай маёмасьці членаў арцелі (рабочай і прадукцыйнай жывёлы, інвэнтару, гаспадарчых будынкаў і г. д) ад $1/4$ да $1/2$ залічваецца ў непадзельны фонд арцелі, прычым большы процант залічэньня ў непадзельны капітал ужываецца да больш заможных гаспадарак. Рэшта маёмасьці залічваецца ў паявы ўзнос члена арцелі.

10. З членам арцелі, што выбывае з яе складу, праўленьне праводзіць разьлік і варочае яму паявы ўзнос, прычым выбыўшаму з арцелі можа быць дадзены надзел толькі за межамі зямельнай плошчы арцелі. Разьлік робіцца, як правіла, пасьля сканчэньня гаспадарчага году.

11. З даходаў арцелі, якія атрымліваюцца пасьля сканчэньня гаспадарчага году, пакрываюцца гаспадарчыя і зьвязаныя з гаспадаркай выдаткі, а таксама і выдаткі на ўтрыманьне непрацаздольных, робіцца адлічэньні ў непадзельны і грамадзкі фонды (ад 10 да 30 проц.—у непадзельны фонд, ад 5 да 15 проц.—у другія грамадзкія фонды) і разьлікі па аплаце працы.

VII. Арганізацыя і аплата працы

Усе работы ў гаспадарцы арцелі робіцца асабістай працай яе членаў, згодна правіл унутранага распарадку, прынятага агульным сходам. Дапускаецца прыцягненьне на с.-г. работы па найме толькі асоб, якія ўладаюць спэцыяльнымі ведамі і падрыхтоўкай (аграномы, інжынеры, тэхнікі і г. д.).

Наём часовых рабочых дапускаецца толькі ў выключных выпадках, калі тэрміновыя работы ня могуць быць выкананы ў патрэбныя тэрміны наяўнымі сіламі членаў арцелі пры поўнай іх нагрузцы, а таксама для будаўнічых работ.

13. Работы разьмяркоўвае ў арцелі праўленьне, згодна правіл унутранага распарадку. Ніхто з членаў арцелі ня можа адмовіцца ад даручанай яму работы.

14. Для правільнай арганізацыі работы членаў арцелі ўстанаўляюцца нормы выпрацоўкі і расцэнкі па асобных відах работ, робіцца ўлік колькасьці і якасьці работы, ужываецца зьдзельная аплата працы і урочная сыстэма.

15. Аплата працы членаў арцелі праводзіцца ў наступным парадку: у працягу гаспадарчага году на харчовыя і іншыя патрэбнасьці членаў арцелі выдаецца авансам (натурай або грашыма) ня больш 50 проц. сумы, якая належыць за работу. У канцы гаспадарчага году робіцца канчатковы разьлік па аплаце працы.

Заўвага. З сум, зробленых членамі арцелі на адыходных промыслах, робіцца адлічэньне ў грамадзкія фонды арцеляй у разьмерах ад 3-х, але ня больш 10 проц. заработку, прычым гэта адлічэньне ў гэтых межах устанаўляецца арцельлю або калгасным аб'яднаньнем.

16. Арцель дае матарыяльную дапамогу сваім непрацаздольным членам, а таксама часова страціўшым працаздольнасьць. Умовы і разьмер гэтай дапамогі вызначаюцца праўленьнем і пацьвярджаюцца агульным сходам у адпаведнасьці з гаспадарчымі магчымасьцямі арцелі, але ня звыш сярэдняга заробку.

VIII. Меры ўзьдзеяньня

17. Усе члены арцелі абавязваюцца падпарадкавацца патрабаваньням статуту, пастановам агульнага сходу і праўленьня, захоўваць правілы унутранага распарадку, акуратна выконваць ускладзеныя на іх праўленьнем работы і грамадзкія абавязкі.

Безгаспадарчыя і нядбайныя адносіны да абагуленага інвэнтару і скаціны разглядаюцца арцельлю, як здрада справе калектывізацыі, як практычная дапамога ворагу—кулаку.

За такія безгаспадарчыя і нядбайныя адносіны да абагуленае маёмасьці, за нявыхад без уважлівых прычын на работу і за іншыя парушэньні дысцыпліны на вінаватых праўленьне накладвае спагнаньні згодна правіл унутранага распарадку (напрыклад, вымова, папярэджаньне, часовае адхіленьне ад работы, штраф і г. д.). У адносінах непапраўных праўленьне арцелі ставіць перад агульным сходам пытаньне аб выключэньні са склада арцелі.

IX. Кіраўніцтва справамі арцелі

18. Справамі арцелі кіруюць агульны сход членаў арцелі і праўленьне. Калі склікан не агульнага сходу, з прычыны шматлікасьці членаў арцелі, або раскіданасьці паселішчаў, сустракае затрудненьні, агульны сход замяняецца сходам упаўнаважаных. Члены сходу ўпаўнаважаных выбіраюцца сходамі членаў арцелі па асобных паселішчах калгасу

19. Агульны сход (або сход упаўнаважаных) зьяўляецца вышэйшым органам кіраўніцтва арцелі, вырашае важнейшыя пытаньні дзейнасьці арцелі, выбірае праўленьне і рэвізійную камісію і зацьвярджае інструкцыю па іх рабоце

Агульны сход (або сход упаўнаважаных) правамоцны пры наяўнасьці ня менш паловіны ўсяго ліку членаў. Пастановы агульнага сходу (або сходу ўпаўнаважаных) прымаюцца большасьцю галасоў адкрытым галасаваньнем.

20 Праўленьне арцелі выбіраецца на год, зьяўляецца выканаўчым органам арцелі і загадвае ўсімі яе справамі. Праўленьне, разьмяркоўваючы паміж сваімі членамі абавязкі па кіраўніцтву гаспадаркай і вытворчасьцю арцелі, ускладвае на адпаведных членаў праўленьня поўную адказнасьць за даручаную ім справу і надае ім патрэбныя для гэтага правы.

Праўленьне абавязана весьці рахункаводзтва па формах і правілах, устаноўленых калгаснай сыстэмай.

21. Рэвізійная камісія правярае дзейнасьць праўленьня, у прыватнасьці—захаваньне статуту, выкананьне вытворчага пляну, дагавароў і абавязацельстваў перад дзяржавай, робіць рэвізію касы, маёмасьці, дакумантаў і справаздачнасьці, дае заключэньні па гадавых справаздачах і робіць справаздачы аб сваёй дзейнасьці перад агульным сходам (або сходам упаўнаважаных).

Узаемаадносіны з калгаснай сыстэмай

22. Арцель уваходзіць членам у . . . . калгаснае аб'яднаньне і вядзе сваю работу пад яго непасрэдным кіраўніцтвам.

На аснове свайго вытворчага пляну арцель заключае з . . . . калгасным аб'яднаньнем дагавор аб кантрактацыі, якім устанаўляюцца абавязацельствы арцелі па арганізацыі с. г. вытворчасьці і плянавай здачы ўсёй таварнай прадукцыі дзяржаве і кааперацыі, а таксама абавязацельствы калгаснага аб'яднаньня і інш. дзяржаўных і кааперацыйных органаў па забесьпячэньні арцелі сродкамі вытворчасьці і прадметамі спажываньня і па арганізацыі крэдытнай дапамогі і агра-тэхнічнага абслугоўваньня арцелі

Дадатак

Аб правядзеньні ў жыцьцё прыкладнага статуту с.-г. арцелі

Тлумачэньне Наркамзему і Калгасцэнтру СССР

Зацьверджана ЦВК і СНК саюзу ССР

Пункт 1. Аб нормах здачы (продажу) загатоўчым органам збожжавай прадукцыі (паводле пункту 22 статуту)

Устанавіць для калгасаў у раёнах пераважна збожжавай гаспадаркі (Паўночны Каўказ, Украіна, Ніжняя і Сярэдняя Волга, Башкірыя, Татарыя, Урал, Сібір, ЦЧО, Казакстан, Крым) і выраблюючых збожжавых раёнаў і іншых вобласьцяй (норму здачы) продажу таварнай збожжавай прадукцыі загатоўчым органам ад адной чвэрці да адной трэці валавога збору, выходзячы з разьліку сярэдняга ўраджаю.

Для калгасаў па-за збожжавымі раёнамі ўстанавіць здачу (продаж) таварнага збожжа па норме, якая не перавышае адной восьмай часткі валавога збору збожжа. Уся іншая маса валавога збору як у збожжавых, так і па-за збожжавымі раёнамі застаецца ў поўным распараджэньні калгасаў.

Пункт 2. Аб азімых засевах членаў сельска-гаспадарчых арцеляй (паводле пункту 4 статуту).

Ураджай азімых культур, засеяных мінулай восеньню членамі сельска-гаспадарчых арцеляй у індывідуальным парадку, належыць засеўшчыкам. Пры абмалоце азімых культур, засеяных у зазначаным парадку, частка сабранага збожжа прадаецца засеўшчыкамі загатоўчым органам, згодна дагавору аб кантрактацыі, частка ідзе ў насенны фонд арцелі, а таксама на аплату калектыўнай уборкі і абмалоту, а рэшта збожжа застаецца ў поўным распараджэньні засеўшчыкаў, прычым ніякіх іншых адлічэньняў у фонды калгасаў з азімых не праводзіцца.

Пункт 3. Аб аплаце працы ў сельска гаспадарчай арцелі (па пункту 15 статуту).

Аплата працы ў калгасах праводзіцца выключна з вынікаў ураджаю і іншых прыбыткаў калгасу. Аплата працы робіцца натурай і грашыма, прычым катэгарычна забараняецца аплата працы калгасьнікаў унутры калгасу выключна грашыма.

У аснову разьлікаў з калгасьнікамі па лініі аплаты працы кладзецца колькасьць і якасьць працы асобнага калгасьніка, згодна пастановы агульнага сходу калгасьнікаў.

Прызнаць неабходным вылучэньне з валавога ўраджаю сельска-гаспадарчых арцеляй і з іх прыбыткаў ад малочнай абагуленай жывёлы—5 працэнтаў для разьмеркаваньня паміж калгасьнікамі, адпаведна маёмасьці, унесенай кожным з іх у абагулены фонд калгасу.

Пункт 4 Аб уступных узносах (па п. 8 статуту).

Устанавіць разьмер уступных узносаў для ўступаючых у калгас 5 руб. для батракоў, ад 5 да 25 р. для беднякоў і серадднякоў, у залежнасьці ад магутнасьці ўступаючай у калгас гаспадаркі.

Наркамзем СССР **Якаўлеў.**
Старшыня Калгасцэнтру **Юркін.**

Што слухаць па радыё
Сёньня, 2-га красавіка

6 гадз. Гімнастыка. Ранішнія навіны. Канцэрт. Трансляцыя Масквы.
10 гадз. 30 хв. Перадача ГСПС для фабзаўмясцкомаў. Са студыі.
11 гадз. Радыёгазэта «Пралетары». Трансл. Масквы.
11 гадз. 30 хв. Канцэрт. Трансл. Масквы.
12 гадз. Паўторныя перадачы радыёгазэты і канцэрт. Тр. Масквы.
17 гадз. Канцэрт. Трансл. Масквы.
18 гадз. Партвучоба. Лекцыя «Саветы і сацбудаўніцтва. Трансл. Масквы.
19 гадз. 30 хв. Радыёгазэта «Пралетары». Трансл. Масквы.
20 гадз. 30 хв. Канцэрт. Трансл. Ленінграда.
23 гадз. 15 хв. Апошнія навіны Трансл. Масквы.
24 гадз. Праграма перадач на заўтра. Са студыі.

Выклікаюцца ў гарКК

Выклікаюцца на паседжаньне парттройкі гарКК на 3-е красавіка, у 6 гадзін увечары, па разгляду партсправаў, у памяшканьні гарКК (Замкавая 26) наступныя т. т.:

Багдановіч, Арлоў—п/к вайлачнікаў, Сакалоў А. Н.—№ авіапарк, Бурак, Навумаў, Полазава Ганна, Мінчанка М. І., Усьцінаў Н. Н.—яч. лесзаводу № 13, Карасёў—яч. сампрамсаюзу, Сушко, Бублікаў—яч. «Прагрэс», Шастакоў І. І., Рэут Б. Я., Кулікоўскі У. С., Вярыга У. Я., Парамонаў П. П., Уладычанскі С. А., Белевіч А. Я., Французаў Я. Н., Сьцяпавенка Ц. Н., Лапіцкая Ю. Н. Карташоў Н. К., Дрызлаў І. П., Мандрык Хв. М, Вайштор К. Я.—МББ чыг., Ляошкін С.—махорачнай ф-кі, Фралоў—новы шлях, Касіраў В. Т., Глазман—ЦРК, Венжык І. М.- яч. шляха-будаўн. вуч.

Прапануецца сэкратарам ячэек, пад іх асабістую адказнасьць, паведаміць выклікаемых т. т. на паседжаньне парттройкі і самім зьявіцца.

У выпадку няяўкі на паседжаньне, у сувязі з тым, што большая частка партыйцаў выклікаюцца ўжо 4—5 раз, справы іх будуць разгледжаны за вочна.

Выклікаюцца на 3-е красавіка а 6 гадзін увечары, у гарКК КП(б)Б на інструкцыйную нараду па пытаньні праверкі рашэньняў праверкомаў у часткі партыі наступныя тт:

Арнштэйн—мастацкі тэхн.
Кроніберг—Гарком КП(б)Б.
Хахлоў—Гарком КП(б)Б.
Шчуцкі—музей.
Рабінін—новая швейная ф-ка.
Багрыноўскі анулярная ф-ка
Сасонка—1 ф-ка «Прафінтэрк».
Івашкін—Гарком КП(б)Б.
Кальтман—Белсінаб.
Замскі.
Бароўскі—Прамтрэст.
Лугавой—Гарсавет.
Шамес—рабфак.
Будневіч—ветінстытут.
Аўсеес—камтрэст.
Берлін—МББ чыг.
Акаркоў—МББ чыг.
Латоўскі—МББ чыг.
Азераў—МББ чыг.
Ламдзен—ветінстытут.
Швайнштэйн—Гарком КП(б)Б.
Шафран—«Дзьвіна»
Левіна—рэд. газ.
Пашкоўская.

Тышлер выключан з шахматна-шашачнай арганізацыі

Шахматна - шашачная сэкцыя ЦСПСБ выключыла з шахматна-шашачнай арганізацыі за рад крымінальных злачынстваў шахматыста **Тышлера** (Віцебск). Тышлер па збаўлен годнасьці шахматыста першай катэгорыі

Вымова

Бюро Гаркому КП(б)Б аб'явіла дырэктару панчошнай фабрыкі таварышу **Жэнінай** вымову з апублікаваньнем у друку за невыкананьне пастановы бюро аб накіраваньні для ЗРК панчошнай фабрыкі бухгальтара.

Прымеце выклік

Адказваючы на выклік т. **Варыкава, Одэгава, Капланскага і Карпава**, пакупаю 16 білетаў лётарэі АЗЭТ і выклікаю на такую-ж колькасьць білетаў тт. **Мэйзіну, Гудзі**.

У. Руткоўскі.

У карысьць МОПР'у

4-ы дзіцячы сад ачаг сабраў у карысьць МОПР'у 26 р. 42 к. і выклікае астатнія дзіцячыя сады пасьледваць яго прыкладу.

Унечарговае паседжаньне пленуму прамысловай сэкцыі Гарсавету

6-га красавіка, а $6^{1/2}$ гадз. увечары, у клюбе мэталістых адбудзецца **унечарговы пленум прамысловай сэкцыі гарсавету**.

На абвестцы дню: 1) Даклад прафэсара **Маліна**: «Барацьба за ўладаньне тэхнікай» і задачы чл. гарадзкога савету і рабочай грамадзкасьці ў гэтай галіне».

Яўка членаў сэкцыі і актыву—абавязкова.

Запрашаюцца: інжынэрна-тэхнічныя і навуковыя працаўнікі гораду, члены іншых сэкцый гарсавету і рабочы актыў.

Уваход членам сэкцыі і актыву па мандатах, інжынэрна-тэхнічным і навуковым працаўнікам—па пасьведчаньнях.

Вытворчы вечар саюзу дрэваапрацоўшчыкаў

Сёньня, а 6 гадз. увечары, у гарклюбе лесдрэўрабочых адбудзецца вялікі вытворчы вечар агляду якасьці прадукцыі лесзавода № 13, фанэрнага завода, фабрыкі гнутай мэблі, інструмэнтальна-мэблёвай фабрыкі, лесзавода № 3 і віцлеспрамгаса.

Яўка дырэктараў паказаных прадпрыемстваў і ФЗМК абавязкова.

На вечары арганізавана выстаўка браку.

Пасьля—мастацкая частка.

Уваход па білетах, разьмеркаваных па ФЗМК.

Да ведама сэкратароў калектываў і ячэек КСМ

Гарком ЛКСМБ паведамляе, што 3-га красавіка на курсах камсамольскага актыву стаіць пытаньне аб арганізацыйнай пабудове камсамольскай працы на прадпрыемстве і ў цэху (даклад. т. Левін).

На занятках павінны прысутнічаць, апрача слухачоў курсаў, усе сэкратары калектываў і ячэек, цэх'ячэек і групоргі, пад адказнасьць сэкратароў ячэек.

Час заняткаў для 2-й і 3-й зьмены а 12 г. дню, для першай зьмены а—7-й г. увечары, у памяшканьні Гаркому КСМ.

Да ведама дэлегатак 1-га і 2-га куста

Сёньня, 2 - га красавіка, а $6^{1/2}$ гадзін увечары, адбудуцца дэлегацкія сходы: 1-га куста—у памяшканьні гаркому партыі, 2-га куста—у клюбе «Парыскай камуны».

Сэкратарам партячэек забясьпечыць яўку дэлегатак.

— Віцебскае кіраўніцтва кадраў паведамляе, што з 27 га сакавіка адчынена сэкцыя сэзоннага рынку працы, працуючая штодзённа з 8 гадзін раніцы да 2 х гадз. дню (Пляц Волі, № 1, сэкцыя падлёткаў).

З гэтага-ж дню сэкцыя падлёткаў працуе выключна з 2-х гадзін дню да 4 х гадз., акрамя выходных дзён.

Вучот спэцыялістых вытвараецца таксама з 2-х гадзін дню да 4-х гадзін.

Адказны рэдактар **Я. Рубінштэйн.**

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР — Рабочы драматычны тэатр

Сёньня, у чацьвер, 2-га красавіка, два адчыненых спэктаклі прэм'ера **ЗАВІРУХА** ў 10 мал.

Застаўшыяся білеты прадаюцца ў касе тэатру.

Па калектыўных заяўках 35 проц. скідка.

АРТЭАТР — Спэктаклі дзяржаўнага тэатру музкамэдыі і камопэры.

Сёньня, ў чацьвер, 2 красавіка, прэм'ера!

ПАДВЯЗКА БОРДЖЫЯ

музкам. у 3-х д.

Пачатак а 8 гадз. увеч. Білеты—у касе тэатру.

ЦЫРК (т-ва «Прыхільнікі дзяцей»)

Сёньня, у чацьвер, 2-га красавіка,

КОННЫ ЦЫРК

пад кіраўніцтвам вядомага дрэсіроўшчыка

А. П. ШУМІЛАВА.

Рэкорд дрэсіроўкі, упяршыню ў Віцебску табло група: коні, вярблюд, карова, алень, буйвал.

СЁНЬНЯ:

1-я гастроль—юны клёўн Юры Шумілаў з дрэсіраваным аслом.—Конь—матэматык.—Бульдогі—наезьнікі на коні Эмір.

САМАЯ РОЗНАСТАЙНАЯ ВЯСЁЛАЯ ПРАГРАМА:

А. П. Расказава, клёўны Энрыка і Борэль, Н. Д. Строева-Кашырская, клёўны Макс і Аляксандр, 4 Траполі, 5 Арк, 4 Эмвальс.

Па калектыўных заяўках скідка 45%

Пач. а $8^{1/2}$ гадзін увечары.

Канфэрансье І. В. Лебедзеў (дзядзя Ваня).

Белдзяржкіно і прэм'ера 30-га сакавіка

СПАРТАК Пачатак 1-га сэансу а 6 гадз. — Толькі 4 дні: 2, 3, 4 і 5 красавіка, замежная камэдыя **Марак** пры ўдзеле **Гарольда Ллойда.**

МАСТАЦКІ Пач. 1-га сэанс. а 6 гадз. увеч. — Новы савецкі фільм **У СУМЕТАХ**

ПРАЛЕТКІНО Пач. 1-га сэансу роўна а 6 гадз. увеч. — ВЯЧЭРНІЯ СЭАНСЫ. Вядомы фільм **ВЕЛЬМІ ПРОСТА**

У ПРАЛЕТКІНО — штодзённа ідзе **дзённы кіно-сэанс для рабочых вячэрніх зьмен ВЕЛЬМІ ПРОСТА**. Толькі 1 сэанс. Пачатак а 12 гадз. дню. Кошт білетаў 30 кап. і 25 кап.

Дзіцячы кіно-тэатр імя Макса Гельца у памяшканьні Пралеткіно — З чацьвярга, 2-га красавіка, **Вайсковыя сабакі**. Толькі 1 сэанс. Пач. а 4 гадз. дню

ЦЫРК (т-ва «Прыхільнікі дзяцей»)

Грандыёзнае дзённае дзіцячае вясёлае прадстаўленьне (пачатак а 2 гадз. дню).

НЯДЗЕЛЯ, 5 КРАСАВІКА

КОННЫ ЦЫРК: коні, вярблюд, буйвал, карова, алень, мядзьведзь, сабакі.

УСЕ НОВЫЯ АРТЫСТЫ. НОВЫЯ КЛЁЎНЫ.

Па калектыўных заяўках скідка 45%.

Канфэрансье І. В. Лебедзеў (дзядзя Ваня).

Білеты прадаюцца загадзя.

АБ'ЯВА

ВІЦЕБСКАЕ РАЕННАЕ СПАЖЫВЕЦКАЕ Т-ВА НА ПАДСТАВЕ РАШЭНЬНЯЎ ЗЬЕЗДУ СПАЖЫВЕЦКАЙ КААПЭРАЦЫІ ад 26 сакавіка г. г. **ЛІКВІДАВАЛАСЯ**

Усе арганізацыі, а таксама і зацікаўленыя асобы могуць прад'яўляць прэтэнзіі **У ЛІКВІДКОМ РайСТ ДА 15 КРАСАВІКА 1931 г.**

Пасьля паказанага тэрміну ніякія прэтэнзіі прымацца ня будуць.

380—5—3 **Ліквідком.**

Прыём на 3-ці і 4-ы курсы ВІЦЕБСКАГА ЭЛЕКТРА - ТЭХНІЧНАГА РАБФАКУ працягнут да 10-га красавіка.

Прыймаюцца рабочыя, якія маюць рабочы стаж ня менш аднаго году, або дзеці рабочых, бацькі якіх маюць ня менш 5 год рабочага стажу.

На 3-м курсе заняткі вячэрнія.

Паступіўшыя на 3-і курс у час заняткаў на рабфаку аслабаняюцца ад вытворчасьці, згодна пастановы НКП на 2 гадзіны раней.

Заняткі на 4-м курсе дзённыя, студэнты 4-га курсу забясьпечваюцца стыпэндыяй на агульных падставах.

Інтэрнатам не забясьпечваюцца.

Дырэктар рабфаку **Якаўлеў.** 388—4—1

Віцебская кантора **БУДАБ'ЯДНАНЬНЯ ЗАПРАШАЕ 3-х БУХГАЛЬТЭРАЎ** для самастойнай работы. Жадана з вытворчым стажам. Зварочвацца ў кантору **Будаб'яднаньня**, Вагзальная 31, пакой 11 да т. **Саснавіна**.

Умовы па згодзе. 382—3—2

Забітыя горам бацькі і родныя паведамляюць аб прадчаснай сьмерці гарачалюбімай дачкі і ўнучкі

Танечкі БЕККЕР,

пасьледваўшай 1-га красавіка, а 12 гадзін дню, пасьля цяжкой хваробы.

Пахаваньне адбудзецца сёньня, 2-га красавіка, а 3-й гадз. дню. Вынас цела з кватэры па Чырвонаармейскай вул., 2.

Адміністрацыя, мясцком, рабочыя і служачыя бальніцы імя Калініна выказваюць свае спачуваньне доктару

Беккеру Л. А.

па выпадку цяжкой прадчаснай утраты ім дачкі—

ТАНЕЧКІ.

Адміністрацыя, мясцком і служачыя амбуляторыі імя Калініна выказваюць свае спачуваньне доктару

Беккеру Л. А.

па выпадку прадчаснай сьмерці любімай дачкі—

ТАНЕЧКІ.

Згубленыя і ўкрадзеныя ніжэйпаказаныя дакуманты, якія лічыць несапраўднымі

ПА ГОРАДУ

Мэтрыка В. Я. Кулевіч 993
Лекавая кніжкка Д. І. Юдзінай 994
Дзіцячая кніжка на кармленьне Аўгенія Аўчынікава 995
Вайсковая кніжка Г. І. Мураўскага 1151
Калгас кніж «Змычка» Е. І. Кавалеўскай 1152
Вайсковая кніжка В. Б. Орух 1153
Пропуск панчошнай фабрыкі № 3169 М. С. Саломонкавай 1154
Вольніцкі № 27 Г. К. Шалаева 1155
Мэтрыка З. З. Кабаковай 1156
Членская кніжка саюзу чыгуначнікаў № 58328 Р. О. Васіленка 1157
Пасьведчаньне асабовасьці чыгункі № 22/в Р. О. Васіленка 1158
Пасьведчаньне асабовасьці чыгункі Е. І. Васіленка 1159
Вайсковая кніжка Д. І. Іванова 1160
Пасьведчаньне асабовасьці чыгункі і адрэзак «В» Н. Н. Бізяева 1161
Пасьведчаньне аб няагоднасьці да ваеннай службы № 960 В. І. Пушкарскага 1162
Каап. кніжка «Змычка» Ф. Е. Багацёнак 1163
Пасьведчаньне асабовасьці М. З. Брайнінай 1164
Акладны ліст І. С. Баранава 1165
Пасьведчаньне асабовасьці Л. Ш. Бейліна 1166
Пасьведчаньне асабовасьці, даведка аб сац. становішчы, выд. Стасеўскім с/с., Высач. р-ну, І. П. Сокалава 1167
Мэтрыка Б. М. Бейлінай 1168

Віцгарліт № 1.
Друкарня «Камінтэрн», Вышынскага, 10.
Тыраж 10.000